№ 46 (404) 10 сьнежня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Свае супраць сваіх**
Кіроўца Віктара Шэймана судзіцца з палкоўнікам міліцыі.
старонка 3

**Пісьменьнікі, на двор!**
Саюзу пісьменьнікаў пагражае закрыцьцё і высяленьне.
старонка 2

**Украіна, якую ніхто не чакаў**
Вочы рэвалюцыі, гімн рэвалюцыі, анэкдоты рэвалюцыі.
старонка 4

**Уладзімер Парфяновіч**
Прыватная ўласнасьць у цэнтры Менску.
старонка 12

# Адбудова сталіцы

Агульнанацыянальны праект «НН»



АРТУР КЛІНАЎ

Старонкі 6—13.

## Украіна стане парлямэнцкай

**Юрыдычна замацаваны вынікі Аранжавай рэвалюцыі.**

Аранжавая рэвалюцыя плаўна перайшла ў эвалюцыю. Выкананы яе апошнія патрабаваньні. У сераду ўкраінская Вярхоўная Рада пакетам зацьвердзіла, а Леанід Кучма проста ў залі пасяджэньняў падпісаў зьмены ў Канстытуцыю, новы склад Цэнтравыбаркаму, зьмены ў закон пра выбары прэзыдэнта. Адначасова была прынятая адстаўка Генпракурора. З восені 2005 г. Украіна ператворыцца ў парлямэнцка-прэзыдэнцкую рэспубліку, у якой урад будзе прызначацца парлямэнцкай большасьцю. Страціў пасаду старшыня Цэнтравыбаркаму Сяргей Ківалаў.

За «пакет» прагаласавалі 402 дэпутаты з 450-ці. Супраць была толькі радыкальная апазыцыя з фракцыі Юліі Цімашэнкі. Не галасаваў сам Віктар Юшчанка — меркаваны пераможца перагаласаваньня, прызначанага на 26 сьнежня. Гэта ягоныя паўнамоцтвы будуць абмежаваныя. Уся ягоная фракцыя «Наша Ўкраіна» галасавала «за», і гэта Юшчанка пераканаў іх у непазьбежнасьці абмежаваньня прэзыдэнцкае ўлады.

Рада атрымае права прызначаць па прапанове прэзыдэнта прэм'ера, міністраў абароны, замежных справаў. Кандыдатуры іншых міністраў прапануе прэм'ер. Генпракурор назначаецца са згоды парлямэнту, Цэнтравыбаркам — самім парлямэнтам. Права прэзыдэнта распускаць Вярхоўную Раду моцна абмяжоўваецца.

Тэрмін паўнамоцтваў парлямэнту, пачынаючы ад наступнага скліканьня, павялічыцца да пяці гадоў. Абірацца парлямэнт будзе паводле прапарцыйнай сыстэмы ад партый і блёкаў.

Канстытуцыйны суд напалову прызначаюць прэзыдэнт і парлямэнт.

Для недапушчэньня выбарчых фальсыфікацый колькасьць «адмацавальных талёнаў», па якіх могуць галасаваць тыя, хто ня мае магчымасьці прыйсьці ў дзень выбараў на ўчастак, абмяжоўваецца лімітам 0,5% ад агульнае колькасьці выбарцаў на ўчастку, а не 4, як раней. Апроч таго, у пашпарце «адмацаванага» будзе ставіцца адпаведная пазнака, якую на выбарчым участку мусяць «пагасіць». Галасаваньне дома дазваляецца толькі інвалідам, якія ня могуць хадзіць, пры наяўнасьці адпаведнай заявы.

Кідаецца ў вочы, што ўсе гэтыя зьмены амаль дакладна супадаюць з патрабаваньнямі беларускае апазыцыі.

Прэм'ер Віктар Януковіч у «пасяджэньні вялікага кампрамісу» ўдзелу ня браў і назваў яго рашэньні «незаконнымі». Ягоныя былыя паплечнікі яго пакінулі, і новым кіраўніком «данецкага» выбарчага штабу стаў Тарас Чарнавіл, сын легендарнага лідэра Народнага Руху Вячаслава Чарнавіла.

Алег Рыбачук, дэпутат «Нашай Украіны», лічыць падзеі серады перамогай свайго кандыдата. А Януковіч? «Гэта цяпер рэгіянальны лідэр», — мяркуе нашаўкраінец. Апазыцыя мела ў сераду ўвечары абвесьціць аб спыненьні мітынгу-марафону на Майдане Незалежнасьці.

**Сяргей Мікулевіч**

Іншыя матэрыялы з Украіны — **старонкі 4, 13**.

**Невядомы супраціў**

Збор біяграфій беларускіх антысавецчыкаў. **Старонка 14**.

**Не жартуйце зь юнакамі на дапросах**

Новы дыск «Нэйра Дзюбэлю» «Тапкі». **Старонка 14**.

АНОНС

**Хто ён (яна), беларускі Юшчанка?**

Тэма наступнага нумару «НН».

**Дык падпісвайся!**

«Наша Ніва» з Новага году будзе выходзіць на 24 старонках штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

НОВЫ АЛЬБОМ

## Вайцюшкевіч & Барадулін




**Гэта музыка, у хвалях якой утульна душы. Музыка, што вырасла з мулявінскіх вусоў. Цёплая і хатняя.**

Зьміцер Вайцюшкевіч, Рыгор Барадулін — «Паравоз каханьня», 2004.

# Пскоў згадаў мінулае

На губэрнатарскіх выбарах у Пскове кандыдат Крамля жыproductвец Яўген Міхайлаў прайграў 7% галасоў бізнэсоўцу Міхаілу Кузьняцову. Незалежныя расейскія газэты назвалі вынік выбараў у суседнім зь Беларусьсю рэгіёне «сэнсацыйным», бо Міхайлаў, дзейны губэрнатар Пскоўскай вобласьці, выкарыстоўваў падчас кампаніі адміністрацыйны рэсурс. Першая асечка ўладаў адбылася ў рэгіёне, што мяжуе з Балтыяй і Беларусьсю.

У апошнім туры губэрнатарскіх выбараў — абсалютна апошнім, бо з Новага году кіраўнікоў рэгіёнаў мае прызначаць сам Пуцін — найбольш уражвалі лічбы тых, хто галасаваў «супраць усіх». Ва ўсіх рэгіёнах гэтая лічба вагалася ад 8 да 25%. Такі «вотум недаверу» немагчыма сабе ўявіць у эўрапейскіх краінах, пагатоў у шчасьлівы час эканамічнага росту і астранамічных цэнаў на нафту і тым больш на мясцовых выбарах, дзе выбіраюць «блізкую ўладу», пры наяўнасьці дзясятка кандыдатаў. Расейцы ня вераць сваім уладам, а эліты далёкія ад народу.

У сьвятле гэтых лічбаў думаецца, што знакаміты амэрыканскі палітоляг Зьбігнеў Бжазінскі (каторы ўжо раз за мінулыя 20 гадоў!) не памыляецца, калі прагназуе перакіданьне ўкраінскай рэвалюцыі на Беларусь, Расею, Малдову, краіны Закаўказьзя і Цэнтральнай Азіі. На думку Бжазінскага, толькі дэмакратызацыя можа ўратаваць Расею ад распаду.

**Мікола Бугай**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Ланцуг неабыякавых

Міжнародны дзень правоў чалавека **10 сьнежня** беларускія праваабаронцы маюць адзначыць ланцугом неабыякавых людзей на Кастрычніцкай плошчы ў Менску а 18.00. Ён сёлета пройдзе пад знакам новых крымінальных справаў супраць лідэраў апазыцыі. Апошняя заведзеная на кіраўніка АГП Анатоля Лябедзьку «за паклёп на прэзыдэнта». Падставай сталі выказваньні палітыка на прэс-канфэрэнцыі 14 кастрычніка, дзе гаварылася пра магчымыя фальсыфікацыі на выбарах і рэфэрэндуме.

## Белавеская пушча

**15 сьнежня** а 18-й гадзіне ў Беларускім ПЭН-цэнтры (вуліца Казлова, 7, 101) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Валер'я Дранчука «Белавеская пушча. Рэзалюцыя SOS». Аўтар прэзэнтуе экспазыцыю сваіх малюнкаў ды новыя аўтарскія выданьні экалягічнай скіраванасьці.

## Арлоў і Вежнавец па-польску

У Варшаве выйшла анталёгія сучаснага беларускага апавяданьня «Беларусь, край, атачаны гарамі...». У зборнік увайшлі творы Уладзімера Арлова, Евы Вежнавец, Уладзімера Някляева, Ігара Бабкова ды іншых сучасных празаікаў. Прэзэнтацыя адбудзецца **16 сьнежня** а 17-й у Варшаве, на вул.Сапежынскай 10а, у Фундацыі Сьцяпана Батуры.

## Самы танны «ARCHE»

Часопіс «ARCHE» абвесьціў падпіску на 2005 год па надзвычай нізкай цане — 2360 рублёў за нумар. Такім чынам рэдакцыя хоча кампэнсаваць нэгатыўны ўплыў на продажы з прычыны забароны прадаваць выданьне ў кнігарнях «Белкнігі». Часопіс выходзіць з пэрыядычнасьцю раз на два месяцы. **Падпісны індэкс 00345**. Падпіску можна аформіць на ўсіх аддзяленьнях пошты.



Паэты Васіль Зуёнак і Эдуард Акулін (зьлева): апошні раз у пісьменьніцкім доме?

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Пісьменьнікі, на двор!

## Саюзу пісьменьнікаў пагражае закрыцьцё й высяленьне

2 сьнежня СБП атрымаў ад Мінюсту папярэджаньне. Прычынай стала тое, што Берасьцейская абласная філія з чэрвеня 2001 г. не здае штомесячнай падатковай дэклярацыі. Гэта ўжо другое папярэджаньне арганізацыі, пасьля трэцяга Мінюст мае права падаць у суд заяву, каб зачыніць арганізацыю.

Праблемы берасьцейскай філіі — тыповыя для СБП: грошай яна ня мае, у любы момант яе могуць выкінуць з офісу, які аплачвае аблвыканкам.

Асноўная ж маёмасная праблема СБП — памяшканьні Дому літаратара. З 1997 г., калі будынак забрала Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, пісьменьніцкі саюз меў у доме, пабудаваным на грошы літаратараў, 1000 м² кабінэтаў і бібліятэкі. Пасьля таго як старшынём арганізацыі ў 2002 г. стаў Алесь Пашкевіч, а не кандыдат ад Адміністрацыі прэзыдэнта, у СБП пачаліся праблемы. За арэнду памяшканьняў ГГУ затрабавала плату ў памеры 10 эўра за 1 м² — грошы, непад'ёмныя для творчага саюзу.

Два гады праблема не знаходзіла вырашэньня, а цяпер ГГУ заявіла, што «ў мэтах упарадкаваньня» забірае сабе памяшканьні Саюзу, пакідаючы толькі два пакоі, плошчай у 38 м². Адзін з тых пакояў сёньня займаюць выканаўчыя органы Літфонду, якім сёньня кіруе генэрал-сэнатар Мікалай Чаргінец, у другім раз на тыдзень адбываюцца пасяджэньні літаб'яднаньня маладых творцаў ды месьціцца частка архіву СБП. Астатнія памяшканьні ГГУ пагражае ў любы момант канфіскаваць. Паводле зьвестак Саюзу, у пакоі старшыні СБП мае разьмясьціцца банкетная заля рэстарацыі.

У лік «пісьменьніцкага канфіскату» трапіла й актавая заля Дому літаратара: раней Саюз мог тут двойчы на месяц бясплатна ладзіць свае вечарыны. Пад забаронай апынулася нават прэзэнтацыя кнігі Генадзя Бураўкіна 2 сьнежня. Адбылася яна толькі таму, што абвесткі пра вечарыну былі распаўсюджаны загадзя.

ГГУ пагражае адабраць у Саюзу таксама бібліятэку й аддаць яе пэдунівэрсытэту. Паводле словаў намесьніка старшыні Саюзу Барыса Пятровіча, у патрабаваньнях ГГУ няма ні канкрэтызацыі, што ж, уласна, канфіскуецца: толькі памяшканьні ці й кнігі таксама, ні юрыдычных падстаў канфіскацыі бібліятэкі. Старшыня Саюзу А.Пашкевіч у гэтым месяцы знаходзіцца ў камандзіроўцы ў Нямеччыне.

Выйсьце зь фінансавага крызісу на сёньня пісьменьнікі бачаць у продажы дому адпачынку «Ісλач». Ёсьць пакупнік, гатовы заплаціць Саюзу за будынак $400 тыс., пакінуць адзін катэдж, 2 га тэрыторыі й выдзяляць штомесяц 10 пуцёвак. За вырučаныя ад продажу грошы пісьменьніцкая арганізацыя магла б набыць будынак у Менску, дзе разьмясьціліся б кіраўнічыя органы СБП і Літфонду. Разгледзець гэтыя прапановы мае агульны сход Літфонду, які кіраўніцтва абяцала правесьці пры канцы гэтага году ці на пачатку наступнага, калі юрысты падрыхтуюць адпаведныя дакумэнты. Загваздка ў тым, што грашыма ад продажу ў такім разе будзе распараджацца старшыня Літфонду.

Некаторыя пісьменьнікі бачаць у загадзе высяляцца спробу націснуць на пісьменьнікаў, каб дабіцца згоды на продаж «Ісλачы», і зьвязваюць усе падзеі з асобай генэрала Чаргінца — адказнага «по писателям».

**Аркадзь Шанскі**

# FM-станцыі плявалі ў «Вока»

Моладзевая ініцыятыва «Вока» падвяла вынікі штурму FM-станцый. На працягу лістапада ўдзельнікі акцыі па тыдні штурмавалі чатыры менскія радыёстанцыі («Альфа-радыё», «Пілёт-FM», «Рокс» ды «Бі-Эй»). Адначасова цэлы месяц адбываўся штурм радыёстанцыі «Новае радыё» з мэтай вярнуць ёй беларускі фармат. Агулам за месяц на ўсіх радыёстанцыях у праграмах па заяўках слухачоў удалося замовіць толькі… 6 беларускамоўных песень: тры разы «Абсэнт», па разе «Люблю» ды «Госьці», а таксама песьню «Сьпявайце са мной» Ягора Ваўчка.

На «Роксе» і «Бі-Эй» няма тэлефону жывога этэру ў віншавальнай перадачы, таму ўдзельнікам штурму даводзілася выкарыстоўваць пэйджэр, факс ды э-пошту. Аказалася, ды-джэі адбіраюць зручныя для сябе пасланьні і ігнаруюць усё, што «не па фармаце». На «Роксе» ў першыя дні чыталіся віншаваньні і ставіліся песьні (адна на праграму), потым зачытваліся толькі вітаньні без канцоўкі, дзе якраз і была замоўлена беларускамоўная песьня, а пры канцы тыдня ды-джэі ўвогуле не чыталі паведамленьняў, напісаных па-беларуску.

Моладзевай ініцыятыве «Вока» на гэтым тыдні споўніўся год, і яе ўдзельнікі маюць намер ладзіць новыя акцыі ў падтрымку беларускага маўленьня.

**АТ**

# www.praunik.org

## On-line-часопіс юрыстаў і палітолягаў

«У незалежнай Беларусі вырасла новая генэрацыя адмыслоўцаў, таму рана ці позна мусіла зьявіцца выданьне, якое рэпрэзэнтавала б тую яе частку, што грунтуе свае досьледы на нацыянальнай парадыгме; частку, для якой беларуская мова ёсьць натуральным складнікам тоеснасьці, а традыцыя «дзяржаўнага» тэксту сягае часоў Вялікага Княства Літоўскага. Мэта — разбурэньне штучных канонаў каляніяльнае традыцыі юрыдычнага й палітялягічнага тэкстаў, распрацоўка запатрабаванага мэтадалягічнага ды тэрміналягічнага апаратаў беларускае школы праўніцтва ды палітычных навук.

У № 1 вас чакае знаёмства з шэрагам тэкстаў, створаных высілкамі студэнтаў старэйшых курсаў, асьпірантаў ды маладых праўнікаў, а таксама перакладамі з ангельскае й нямецкае.

Падставовае зацікаўленьне часопісу — эўрапеістыка. Вялікую долю аналітыкі плянуецца прысьвячаць юрыдычным мэханізмам Эўразьвязу ды сучаснай палітычнай думцы Эўропы. Гэта памкненьне грунтуецца на перакананьні ў неабходнасьці паступовае гарманізацыі беларускага заканадаўства і зьвязаўскага ды распаўсюджаньня стандартаў сучаснае палітычнае культуры эўрапейскіх краінаў на айчыннай глебе».

**З маніфэсту выданьня**

# Свае супраць сваіх

**Старшы апэратыўнік МУС і асабісты кіроўца Шэймана судзіцца з падпалкоўнікам МУС у запасе і ягоным сынам — былым апэратыўнікам і афіцэрам міліцыі.**




**Бацьку й сына Палуніных абвінавачваюць у вымаганьні грошай у кіроўцы Віктара Шэймана.**

На першае судовае пасяджэньне ў пятніцу падпалкоўнік МУС у адстаўцы Васіль Палунін прыйшоў са спартовым рыштункам — раніцаю ён гуляў у валейбол з прадстаўнікамі ГУУС, КДБ і пракуратуры. Адзін гулец зь ягонай каманды — першы намесьнік начальніка ГУУС Аляксандар Зыль — калісьці паспрыяў пераводу Палуніна-малодшага з раённага УУС у Менск. Аднак у гэтым выпадку сувязі не дапамаглі — на Палуніных заведзена крымінальная справа па ч.2 арт.208 (вымаганьне, зьдзейсьненае групай асоб па папярэдняй змове). Вэтэрану міліцыі і ягонаму сыну Івану, былому апэратыўніку, пагражае тэрмін зьняволеньня ад трох да васьмі год. У якасьці пацярпелага выступае Аляксандар Богдан – старшы апэратыўны супрацоўнік па асабліва важных справах МУС і асабісты кіроўца Шэймана.

Паводле высновы следзтва, Палунін-малодшы, калі працаваў у гарадзкім УУС па лініі незаконнага абароту наркотыкаў, 28 жніўня мінулага году наўмысна кінуўся пад аўтамабіль, каб «стварыць умовы для вымаганьня грошай», а потым разам са сваім бацькам шантажаваў бацьку вадзіцеля аўто — А.Богдана. Той зьвярнуўся ў КДБ, супрацоўнікі якога і затрымалі Палуніна-старэйшага адразу пасьля перадачы 1000 даляраў.

Слуханьні па гэтай справе распачаліся ў пятніцу, у панядзелак і аўторак прадоўжыліся. За амаль 20 гадзін суд дапытаў сьведкаў — былых калег і начальнікаў Палуніна-мал., даішнікаў, дактароў ды непасрэдных удзельнікаў падзей.

Першым на допыт судзьдзя Есьман выклікаў Палуніна-старэйшага. Вэтэран міліцыі відавочна хваляваўся — можа, таму адказваў няўпэўнена і эмацыйна: грошай ня браў і ня ведае, якім чынам яны трапілі да яго, аднак з Богданам-старэйшым сустракаўся, бо «кіраваўся бацькоўскімі пачуцьцямі».

Іван Палунін распавёў, што здарылася ў той дзень — 28 жніўня. Апэратыўная група, што складалася зь пяці супрацоўнікаў міліцыі, праводзіла апэрацыю па выяўленьні асоб, зьвязаных з распаўсюджваньнем наркотыкаў, каля начной аптэкі, што на вуліцы Раманаўская Слабада. З аўтамашыны, якая пад'ехала да прыпынку, выйшаў чалавек і набыў у гэтай аптэцы інсулінавыя шпрыцы і ампулы. Пры спробе затрымаць машыну і быў зьдзейснены наезд. Прычым вадзіцель зь месца злачынства адразу зьехаў і яго не дагналі, хоць, паводле слоў Палуніна, іх машына ехала з хуткасьцю 140—160 км/г. Не затрымалі і пакупніка шпрыцаў.

Як потым высьветлілася, за рулём быў сын вадзіцеля Шэймана — Зьміцер Богдан. Паводле ягоных слоў, ён ехаў адзін, спыніўся, каб набыць цыгарэт, пачаў рух і раптоўна адчуў удар па сваёй машыне. На судзе ён сказаў, што чалавека перад сваім аўто ня бачыў, хоць раней сьцярджаў адваротнае. Зьехаў, таму што спужаўся фізычнай расправы, і рухаўся па горадзе з хуткасьцю, ня большай за 60 км/г. На наступны дзень сам прыехаў у ДАІ.

Цікавая акалічнасьць: загадчык аддзелу дазнаньня ўпраўленьня ДАІ Ўладзімер Гайшун у выніку выявіў віну ў ДТЗ Богдана-мал., але праз паўгоду, у траўні 2004 г., па ўказаньні рэспубліканскай пракуратуры справу перагледзелі. Вінаватым быў прызнаны Палунін-мал. Гайшун на судзе ня ўзяўся растлумачыць, ці зьвязаная апэратыўнік, які выконваў заданьне, пешаходам.

Богдан-старэйшы прызнае віну свайго сына толькі ў тым, што ён зьехаў зь месца ДТЗ. Не адмовіў ён і таго, што сам выйшаў на Палуніных, каб нейк залагодзіць віну сына. Аднак, паводле ягоных слоў, Палуніны заняліся натуральным вымаганьнем: старэйшы гаварыў пра свае сувязі ў кіраўніцтве МУС, малодшы быццам бы казаў, што Богдана-мал. вельмі проста зрабіць наркаманам. Нібыта патрабавалі 1000 даляраў для пачатку, потым хацелі яшчэ 1500—2000 даляраў. І нават нібыта казалі, што зрабілі яму зьніжку, бо ён супрацоўнік міліцыі.

Апэратыўная здымка пацьвярджае тое, што Богдан-ст. дае грошы Палуніну-ст., хоць там не відаць, што другі іх бярэ. Трымаўся на допыце вадзіцель Шэймана досыць упэўнена, у паказаньнях ня блытаўся і прыводзіў аргумэнты.

Па выніках службовай праверкі па гарачых сьлядах былі абвешчаны вымовы непасрэднаму начальніку Палуніна-мал. Яўсеенку, камандзіру афіцэру Драздову, адказнаму за працу з асабовым складам Бізюку, самога Палуніна звольнілі за дэскрэдытацыю органаў унутраных спраў. Непасрэдна адказны за тую апэрацыю Пранякін ніяк пакараны ня быў, але праз некаторы час яго пазбавілі волі па іншай справе — «махлярства».

Абарона ў асобах адвакатаў С.Лепеша і Т.Сідарэнкі хадайнічае аб спыненьні справы з прычыны адсутнасьці ўласна злачынных дзеяньняў. На думку адвакатаў, той факт, што Палунін-мал. кінуўся пад машыну з мэтай стварэньня ўмоў для вымаганьня грошай, папросту не вытрымлівае ніякай крытыкі. На думку С.Лепеша, з усіх зробленых абвінавачаньняў Палуніных можна абвінаваціць толькі ў распаўсюдзе зьвестак пра тое, што Богдан-мал. — наркаман, хоць у пададзенай заяве і першых тлумачэньнях пацярпелага пра гэта гаворкі не ідзе. Між тым, сьледзтва ўстанавіла, што ён не ўжываў наркотыкаў.

Самі Палуніны лічаць, што яны сталіся ахвярамі адміністрацыйнага самавольства, і настроены адстойваць свой гонар да канца. У перапынку Іван Палунін, які некалі служыў у спэцназе пад кіраўніцтвам Паўлючэнкі, кінуў з горыччу: «Крыўдна, працуем на дзяржаву, і так выходзіць».

Аляксандар Богдан, што возіць Шэймана з 1994 г., хаваўся ад фатакамэр і адварочваўся ад журналістаў. Справа, у якую ён аказаўся ўцягнуты, сапраўды не з прыемных. Да гонару беларускай судовай сыстэмы, працэс адкрыты. Закрытасьць спарадзіла б больш плётак, чым яго аб'ектыўнае асьвятленьне.

**Сяргей Будкін**

# Вочы рэвалюцыі

## «Канал сумленных навін» б'е рэкорды ўкраінскіх тэлерэйтынгаў

**Апошнія тры тыдні ва Ўкраіне бесьперапынна працуюць мільёны тэлевізараў. Зазірні ў любы экран — і ўбачыш у кутку лічбу «5», лягатып «Пятага каналу». Каб ня ён, хто ведае, ці была б «Аранжавая рэвалюцыя» пасьпяховай.**

Каб трапіць у будынак «Пятага каналу», трэба перайсьці па пешаходным мосьце на Рыбальскі востраў, індустрыяльны раён, што месьціцца на атачанай Дняпром паўвысьпе. Ажно ня верыцца, што тут, на 11-м паверсе шэрага гмаху, разьмешчанага на тэрыторыі заводу «Ленінская кузьня», куюць рэвалюцыю.

Ганна Гаражэнка, кіраўнік міжнароднага аддзелу, сьцьвярджае: «Нам часта закідаюць, што «Пяты канал» зрабіў рэвалюцыю ва Ўкраіне, людзі Януковіча называюць нас дэструктыўным элемэнтам. Але на «Пятым канале» працуюць толькі 9 журналістаў, якія расказваюць пра ўнутраныя падзеі, 4 «міжнароднікі», якіх цяпер таксама кінулі ім на дапамогу, а таксама некалькі вядучых. Ці магчыма зрабіць рэвалюцыю такімі малымі сіламі? Калі б народны настрой не дасягнуў пункту кіпеньня, ніякія мэдыі ня вывелі б столькі людзей на вуліцы. Мы проста асьвятляем падзеі».

«Натуральна, у нашай працы было шмат небясьпек, — кажа Ганна, — асабліва, калі журналісты выяжджалі на ўсход». Улада грэбліва ставіцца да «Пятага каналу», — лічыць яна. «Адзін раз нашай здымачнай групе дазволілі прайсьці ў Кабмін. Ну вось, падумала я, нарэшце ўлады вырашылі з намі паразмаўляць! Але выявілася, што нас пусьцілі толькі для таго, каб мы маглі правесьці за сабою, нібы «прычэп», здымачную групу каналу РТР, а таксама вывесьці яе з будынку, ачэпленага дэманстрантамі». Нас проста выкарысталі».

Экстрэмальныя ўмовы працы зрабілі з журналістаў сапраўдную каманду.

Працяг на старонцы 4.

### Ярмошына і Падабед non grata

Эўразьвяз забараніў уезд на сваю тэрыторыю кіраўніцы ЦВК Беларусі Лідзіі Ярмошынай і начальніку менскага АМОНу Юр'ю Падабеду. Яны папоўнілі пэрсанальны сьпіс «неўязных» беларускіх чыноўнікаў. Першую ЭЗ лічыць вінаватай у падтасоўцы вынікаў выбараў і рэфэрэндуму 17 кастрычніка, другога — у зьбіцьці мірных дэманстрантаў.

### Беларусы скупляюць золата

За лістапад 2004 г. грамадзяне Беларусі купілі амаль 32 кг залатых зьліткаў — удвая больш, чым у кастрычніку. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар Нацбанку. Агулам з пачатку году куплена 169 кг золата — удвая больш, чым у 2003 г. Самыя папулярныя зьліткі — па 10 г.

### Любіміца пракурораў

Журналістку Ірыну Халіп 7 сьнежня зноў выклікалі ў пракуратуру, на гэты раз праз ейны артыкул у расейскай «Новой газете». У публікацыі «П'яныя каты» згадвалася, што Беларусь — адзіная эўрапейская краіна, дзе існуюць сьмяротныя пакараньні ды апісваліся падрабязнасьці расстрэлаў. Пракурораў Станіслава Новіка і Станіслава Голіка цікавіла, як журналістка здабывала факты для свайго матэрыялу.

### Русакевіч недаступны

Як паведамляе Беларуская асацыяцыя журналістаў, Мініфармацыі адмовілася правесьці сустрэчу з рэдактарамі недзяржаўных выданьняў. БАЖ зьвяртаўся з такой просьбай для абмеркаваньня сытуацыі ў сфэры СМІ, дзе прыпыняецца выхад усё новых газэтаў. На мінулым тыдні міністар Уладзімер Русакевіч у інтэрвію «Інтэрфаксу» заявіў, што рыхтуецца прыняцьце новага Закону аб друку, паводле якога Інтэрнэт-выданьні таксама будуць разглядацца як СМІ.

### Ад'езд прадстаўніцы МВФ

Скончыўся тэрмін працы сталай прадстаўніцы Міжнароднага валютнага фонду ў Літве й Беларусі Зузаны Брыксіёвай. Місія МВФ у Літве зачыняецца з прычыны ўступленьня краіны ў Эўразьвяз. У Беларусь новага прадстаўніка МВФ не прышле, бо доўгі час ня мае праграмаў супрацоўніцтва. Менскі офіс МВФ не зачыняецца, але будзе займацца толькі тэхнічнымі пытаньнямі. Афіцыйныя прадстаўнікі Беларусі заявілі, што краіна ня будзе працаваць на атрыманьне крэдытаў ад МВФ.

### Дыскусіі ў Народнай Грамадзе

16 з 28 сяброў выканаўчага бюро БСДП (НГ) выступілі супраць кіраўніка партыі Міколы Статкевіча. Сябры партыі разыходзяцца ў бачаньні мэханізмаў стварэньня адзінай сацыял-дэмакратычнай партыі і яе будучых удзельнікаў. Спрэчка ў партыі можа скончыцца яе чарговым расколам і зьніжае шанцы М.Статкевіча на кандыдацтва ў прэзыдэнцкіх выбарах-2006.

### Сёньня Ўкраіна, заўтра мы!

Падчас вывешваньня такой расьцяжкі над Нямігай затрыманы «зубровец» Аляксандар Маршэўскі.

### Лібэралізаваны закон

Польскі Сэнат зьмякчыў правілы ўжываньня мовы нацменшасьцяў. Сойм дазволіў уводзіць такую мову як афіцыйную ў гмінах, дзе жывуць ня менш за 50% прадстаўнікоў нацменшыняў. Верхняя палата парлямэнту зьнізіла планку да 20%. Беларусы Беласточчыны віталі гэтыя зьмены.

**АШ; БелаПАН, gazeta.pl**

# Вочы рэвалюцыі

Працяг са старонкі 3.

«Нас злізіла забастоўка ў кастрычніку, калі нас намагаліся закрыць, — галадалі і кіраўнікі, і прыбіральшчыцы. 190 гадзін прасядзелі тут, у фае, на гэтай канапе».

Слоган «Пятага» — «канал сумленных навін». Калегі-тэлевізійшчыкі да «Пятага каналу» ставяцца з павагай. Натальля Гумянюк, якая працяглы час працавала на ICTV, а цяпер уключылася ў стварэньне новага буйнога тэлеканалу K1, лічыць, што «Пяцёрка» адрозьнівалася ад іншых украінскіх каналаў адсутнасьцю цэнзуры. «Так, «Пяты канал» належыць Пятру Парашэнку, аднаму з багатых людзей, блізкіх да Юшчанкі. Але калі ствараўся тэлеканал, была падпісана дамова аб неўмяшаньні ў рэдакцыйную палітыку».

Рэвалюцыя тэлеканалаў, калі журналісты асноўных СМІ разам адмовіліся даваць у этэр «замоўленую» ўладамі інфармацыю, мела нечаканы вынік для «Пятага». Калі раней ён быў відавочна самым аб'ектыўным, дык цяпер пачаў здавацца прапагандысцкім, бо зьвесткі пра падзеі ўжо даюць практычна ўсе тэлеканалы, а каардынацыю дзеяньняў ажыцьцяўляе, у асноўным, «Пяты канал».

Аднак, на думку Натальлі, заангажаванасьць «Пятага» не была яго заганай. «Бяз гэтага не было б рэвалюцыі. Ён ня толькі інфармаваў, але й падтрымліваў людзей на плошчы. Ягоны «мэсыдж» быў выразны: мы павінны перамагчы гэтую прагнілую ўладу. Гледачы ня бачылі ў такім закліку нічога дрэннага». У Кіеве «5-ы» глядзяць ня толькі на кухнях, але й кампаніяй у барах, у чарзе ў краме ды проста грамадою на вуліцах.

«Нашы навіны выходзяць штогадзіны», — кажа Дзяніс Слабадзян, рэдактар «Пятага». Ён прызнае, што журналісты ўжо стаміліся: «З другога туру выбараў не сканчаецца гэты тэлемарафон. Усе працуюць на знос і на будучыню не загадваюць — усё мяняецца. Але я ведаю, што ёсьць пляны кіраўніцтва пашырацца, рабіць інфармацыйны канал накшталт CNN».

Гэтыя задумы выглядаюць цалкам рэальнымі. Паводле падлікаў кампаніі GfK-USM, якая ва Ўкраіне дасьледуе тэлеаўдыторыю, за апошнія два тыдні «5-ы канал» імкліва набраў папулярнасьць. Цяпер ён мае 10,98% украінскае тэлеаўдыторыі. Большыя долі маюць толькі «Інтэр» (22,63%) ды «1+1» (16,08%). Пры гэтым яшчэ ў кастрычніку «5-ы канал» знаходзіўся на 13-м месцы з доляй аўдыторыі 1,26%. І гэта пры тым, што ў Данецку ён проста вымкнуты.

Як вынікае, для высокага рэйтынгу не абавязкова круціць блякбастары, закупляць найноўшае абсталяваньне ды наймаць «піяршчыкаў» — дастаткова паказваць людзям тое, што насамрэч адбываецца ў краіне. Гэта навука нашым тэлебосам, якія адчайна змагаюцца з хранічнай непапулярнасьцю беларускай тэлевізіі. А масавы бунт журналістаў адыёзных каналаў, якія адмовіліся даваць у этэр ілжывую інфармацыю, як толькі ўбачылі, што ўлада можа не ўтрымацца ў крэсьле, — трывожны знак для беларускіх дзяржаўных дзеячаў, звыклых лічыць тэлежурналістаў пэрсаналам для абслугоўваньня іх інтарэсаў.

**Алесь Кудрыцкі**




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Пасьля таго, як на мітынгу ў Данецку жонка Віктара Януковіча распавяла, што прыхільнікі Юшчанкі ў Кіеве харчуюцца «наколатымі апэльсінамі» ды носяць «амэрыканскія валёнкі», украінскія жартаўнікі займелі новую тэму. На здымку: у Кіеве проста на вуліцы прапануюць валёнкі «Made in USA» за 100 даляраў 99 цэнтаў і апэльсіны з двума-трыма ўткнутымі шпрыцамі.**

# Гімн украінскай рэвалюцыі

«Махінацыям — не! Не — мане! Мы ня быдла! Мы не казлы! Мы Ўкраіны дочкі й сыны! Зараз ці ніколі! Годзе чакаць! Нас шмат, нас не перамагчы!» Гэты рэп сьпявае сёньня ўвесь Кіеў. Ён гучыць паўсюль — яго рытм нясецца з тэлеэкранаў, устаноўленых ў намётавым мястэчку на Хрэшчаціку, перад Вярхоўнай Радай і на апазыцыйным «Пятым канале», з таксі і машын, якія езьдзяць па Кіеве з аранжавымі сьцягамі ў адчыненых вокнах.

Словы «Разом нас багато, нас нэ подолаты!» (нас не перамагчы) сталі гімнам Аранжавай рэвалюцыі, чарадзейным клічам, які яднае людзей і дае надзею на перамогу. «Я ганаруся тым, што мы напісалі песьню, якая дае людзям сілы ў змаганьні за праўду. Цяпер яе сьпявае ўся Ўкраіна. Ці можа быць нешта больш прыемнае для музыканта?» — кажа Раман Калын, лідэр гурту «Грынджолы» з Івана-Франкоўску, які запісаў «Разам нас багата».

Грынджолы — гэта гуцульскія сані. Яшчэ некалькі тыдняў таму пра гурт і назву тых саняў мала хто ведаў. Усё зьмянілася пасьля 21 лістапада, калі ў адказ на фальшаваньне вынікаў выбараў мільёны людзей выйшлі на вуліцы. Яны скандавалі: «Мы разам, нас шмат і нас не перамагчы!»

Хлопцы з «Грынджолаў» крыху зьмянілі пасьлядоўнасьць, каб словы лепш пасавалі да рытму, напісалі некалькі радкоў тэксту пра Юшчанку, супраць маны й фальсыфікацыі, усё гэта паклалі на простую рэпавую музыку і хуценька запісалі песьню, зусім ня думаючы, што праз некалькі дзён яна стане хітом на ўсёй Украіне. «Лёгка запамінаецца і гаворыць пра тое, што адчуваюць сёньня ўсе», — так Раман тлумачыць посьпех «Грынджолаў». «Разам нас багата» круцяць мясцовыя радыёстанцыі, тысячы людзей згружаюць яе з Інтэрнэту. Кожны вечар да палацу прэзыдэнта Кучмы на вуліцы Банкавай у Кіеве прыяжджае чорны «Крайсьлер» з дынамікамі на даху, зь якіх гучыць ўсю ноч гэтая песьня, каб падтрымаць студэнтаў, якія жывуць у намётах на сьнезе. Людзі саграюцца, танцуючы пад рытм «Разам нас багата», як у наркатычным трансе, крычаць «Юшчанка — так!» (нехта дадае «Януковіч — фак!»), і так штоноч. Аранжавая дыскатэка безь перапынку.

Некалькі сотняў мэтраў далей перад атачаным апазыцыяй Домам ураду стаіць іржавая белая «Лада Самара». Яе ўладальнік паставіў на даху дынамік ад музычнага цэнтру і таксама безь перапынку круціць «Разам нас багата!». «Згрузіў песьню з Інтэрнэту, запісаў на дыск. Уключаю яе, каб тым, што мёрзнуць на вуліцы, было весялей. Гэта мой асабісты ўклад у рэвалюцыю», — сьмяецца кіроўца «Лады».

«Настаў такі момант, калі музыканты павінны былі вызначыцца. Большасьць падтрымала апазыцыю, хоць улада спакушала іх грашыма, славай, часам на тэлебачаньні», — кажа Слава Вакарчук, лідэр папулярнага рок-гурту «Акіян Эльзы». Слава ня толькі сьпявае на мітынгах, ён ходзіць на дэманстрацыі, блякады, падгарае натоўп, яго можна сустрэць і ў парлямэнце, і перад ланцугом узброеных міліцыянтаў каля прэзыдэнцкага палацу.

«Супольнасьць разумных, моцных, незалежных, без правабярэжных і левабярэжных», — сьпявае іншы гурт — «Тартак», пратэстуючы супраць штучнага падзелу краіны. Яго песьня «Не хачу!» стала іншым гімнам рэвалюцыі. «Тартак» пераконвае: «Бо так лёгка можаш зьмяніць сваё жыцьцё, дастаткова выйсьці на вуліцу і адчуць сябе часткай аднаго народу».

Песьні ўкраінскай рэвалюцыі можна згрузіць з інтэрнэт-старонкі http://artvertep.dp.ua

**Алесь Трафіменка; паводле gazeta.pl**

САЛІДАРНАСЬЦЬ

## 200 беларусаў назіральнікамі

Украінская апазыцыя заклікала «ўсе сяброўскія нацыі» дасылаць як мага больш назіральнікаў на выбары 26 сьнежня. Ці будуць у ім браць удзел беларусы?

Мікалай Астрэйка, каардынатар арганізацыі «Партнэрства», якая ў кастрычніку ладзіла назіраньне за выбарамі й рэфэрэндумам у Беларусі, кажа, што ва Ўкраіну ў складзе міжнароднай місіі паедуць 200 беларусаў, якія маюць практычны досьвед назіраньня.

Юрыст незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна» Ўладзімер Лабковіч дадае, што ўзяць пасільны ўдзел у назіраньні могуць і журналісты: «Няцяжка атрымаць часовую акрэдытацыю праз украінскі МЗС». У назіраньні можна ўдзельнічаць і праз супрацоўніцтва зь міжнароднымі арганізацыямі, філіі якіх зарэгістраваныя ва Ўкраіне і ў функцыі якіх уваходзіць назіраньне.

**АШ**

# Сядзяць Кучма і Януковіч...

**Украінскую рэвалюцыю немагчыма ўявіць без цунамі анэкдотаў, скетчаў, карыкатур на кандыдата ад улады Віктара Януковіча. Як можа чалавек зь дзьвюма ходкамі на зону казаць, што ён апірышча правапарадку? Як можа чалавек, які піша слова «прэм'ер-міністар» з трыма памылкамі, ганарыцца прафэсарскім дыплёмам? Як можа чалавек, у якога трапілі яйкам, казаць, што ён ахвяра тэракту? Хітовыя анэкдоты пра «Янука» сабраў Лёлік Ушкін.**

* * *

— Мыкола!

— Шо?

— Ты чуў, як кляты маскалі нашага Юшчанку называюць?

— Як?

— Януковыч!

— Поубываў бы!

* * *

Пасьля васямнаццатага віншаваньня ад Пуціна з нагоды перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах Януковіч заявіў, што афіцыйна пашле расейскага прэзыдэнта на тры літары, калі той будзе і далей зьдзекавацца.

* * *

Сядзяць Кучма і Януковіч на нарах. Януковіч глядзіць у акно і кажа:

— Вось і сонца села.

Кучма:

— Ну, Юшчанка! Што хоча, тое і робіць!

* * *

Расейскі «Витязь», вярнуўшыся ў Маскву, выгружаецца з самалёта і дружна скандуе: «Ю-ШЧАН-КА!..»

* * *

Ідзе баба з кірмаша, пабачыла Януковіча на перадвыбарчым бігбордзе і аж прысела: «Бадай цябе халера — зноў яйкі забылася купіць!»

* * *

Сабраў Януковіч у кабінэце міністраў і кажа:

— У мяне дзьве навіны: добрая і дрэнная. Пачынаю з дрэннай. Пра мяне расказваюць анэкдоты. А цяпер добрая — яны незразумелыя.

* * *

Журналістка падчас прэс-канфэрэнцыі пытае ў Януковіча:

— Віктар Фёдаравіч, скажыце, якія перадачы вам больш за ўсё падабаюцца?

Януковіч:

— Ну... гарбата там, цыгарэты...

## Мова і «язык»

У Віцебскай вобласьці па-беларуску навучаецца 34 711 вучняў або 21,5% ад усяе колькасьці вучняў у вобласьці. Ёсьць тры беларускамоўныя гімназіі — у Полацку, Глыбокім і Віцебску. Па-ранейшаму няма ніводнай беларускамоўнай школы ў родным горадзе Караткевіча Воршы. Цяпер пэўныя надзеі на зьмены ўскладаюцца на тое, што былая кіраўніца школьнае адукацыі ў горадзе стала дэпутаткай ППНС і цяпер мусіць пакінуць сваю пасаду ды зьехаць на новую працу ў Менск.

## Газэта «Sancta Barbara»

У гонар 5-годзьдзя стварэньня Віцебскай дыяцэзіі Рыма-каталіцкага касьцёлу ў Беларусі парафіяне касьцёлу Сьв.Барбары зь Віцебску выпусьцілі першы нумар газэты, якая так і называецца — «Sancta Barbara». Паводле словаў пробашча кс.Міхала, парафіяльная газэта зьявілася ў выніку ініцыятывы маладых вернікаў, частка зь якіх навучаецца ў віцебскіх ВНУ. Першы нумар зьмяшчае напісаныя па-беларуску матэрыялы, сярод якіх інтэрвію з ксяндзом-біскупам Уладзіславам Блінам, паведамленьні пра пачатак пілігрымкі ў Вільню на ўрачыстасьць Маці Божай Вастрабрамскай ды сьвяткаваньне дня сьв.Язафата Кунцэвіча ў Віцебску.

## Вялейшчына на Віцебшчыне

Сьвежым струменем падчас фэстывалю бардаўскай песьні «Віцебскі лістапад» прагучала выступленьне Ўладзімера Цануніна зь Вялейкі. Хаця б таму, што ён адзіны сьпяваў свае вершы па-беларуску. Да таго ж зьместам ягоных твораў была наша, беларуская рэчаіснасьць, у прыватнасьці, наступствы чарнобыльскай бяды, у выніку якіх У.Цанунін і апынуўся ў далёкай ад сваіх родных мясьцін Вялейцы. Там, у Вялейцы, ён і стаў удзельнікам творчага калектыву аўтарскай песьні «Элегія», у якім цяпер пяць чалавек.

**Міхал Чарвінскі, Віцебск**

## Як стаць знакамітым?

Бабця, якой ужо без трыццаці гадоў сто, павітаўшыся са шкляным богам, вырашыла пакарміць качак. Птушкі былі дзікія і сядзелі на танюсенькім лёдзе Валатаўскога возера, куды і рушыла старая. Лішне казаць, што лёд пад ёй праваліўся. Гэта заўважыў мінак і праз мабільнік выклікаў ратаўнікоў з МНС. Як ні дзіўна, ледзяная лазьня амаль не далася бабульчынаму здароўю ў знакі. У больніцы пабыла пару дзянькоў, затое ўрабілася гомельскай знакамітасьцю.

## Злачыннасьць маладзее

Кагадзе міліцыя затрымала вучняў сёмай і дзявятай клясы аднае з гомельскіх школ. Спачатку смаркачы выцягнулі радыё з «опэля». Ачмурэлыя ад такога посьпеху, яны паставілі «падняць» яшчэ адну «тачку»: зламалі люк «фарда» і паспрабавалі ўмыкнуць магнітолу і 15 пушак абутковага крэму. На гарачым іх злавіў участковы. Злачыннасьць маладзее, і гэты выпадак, на жаль, не адзінкавы.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Сагравае вера

Да 1 кастрычніка павінны былі пракласьці цеплатрасу ад Аршанскай ЦЭЦ да цэнтру гораду. Але, як часта ў нас здараецца, перад працаўнікамі «Віцебскаблцеплабуду» паўстала шмат праблем: то, капаючы траншэю, наткнуцца на водаправодныя трубы, не пазначаныя на схемах, то зачэпяць розныя кабэлі або адкапаюць чалавечыя парэшткі (акрамя могільніку XVI—XVII ст., знайшлі асобна два чарапы 40-гадовага мужыны ды дзіцяці, якія сьледчыя пракуратуры датавалі 1930—1940-мі гадамі). Пачыналіся ўзгадненьні ды латаньне прабітых каўшом экскаватара трубаў. А час ішоў. Нарэшце, не хапіла «нейкіх» 100 мэтраў трубаў вялікага дыямэтру. Пакуль іх замаўлялі ды прывозілі з Калінінграду, прайшоў не адзін тыдзень. І вось зусім «нечаканa» выпаў сьнег ды ўдарылі маразы. Траншэі ж так і засталіся незасыпанымі. Найбольш пацярпелі ад гэткай нядбайнасьці й безгаспадарчасьці службі разьмешчанага побач зь цеплатрасай касьцёлу Сьв.Язэпа. Яны ды вернікі ўжо прызвычаіліся ў апошнія гады сустракаць Каляды ў неацепленым будынку касьцёлу, бо некалькі гадоў ідзе яго рэканструкцыя. Але раней можна было сагрэцца ў прыбудове да касьцёлу, дзе месьціцца кляштар. Цяпер жа і тут сьцюдзёна.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Баранавіцкі лёд

У Баранавічах будзе пабудаваны лядовы палац. Гэтак вырашыў Берасьцейскі аблвыканкам і пералічыў у гарадзкі бюджэт 50 млн рублёў на распрацоўку праекту. Для баранавіцкіх уладаў гэта было неспадзяванкай — дагэтуль невядома, дзе той палац стане. Акрамя ўласна лядовага палацу загадана будаваць побач іншыя спартовыя пляцоўкі, рэстарацыю і кіназалю.

Пра «хакейную пляцоўку» запыталася ў Лукашэнкі нейкая студэнтка падчас адкрыцьця Баранавіцкага ўнівэрсытэту. Той паабяцаў, што ў Баранавічах лёд будзе, і вось абяцанка пачала спраўджвацца.

**Руслан Равяка, Баранавічы**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Удзень Менск узорна-паказальны, гранітна-таталітарны. На выяву індывідуальнасьці менчукам застаецца ноч, і тут мы можам пабачыць горад, якога ня ведаем. На фота: цыгарная вечарына ў адным з начных клюбаў 2 сьнежня.**

# Валун Пілсудзкага застанецца ў Вялейцы!

**Гісторыя з мэмарыяльным валуном памяці Юзафа Пілсудзкага («НН» №41, 43) атрымала працяг. Вялейскі райвыканкам, зважаючы на пратэст грамадзкасьці, пастанавіў пакінуць камень на тэрыторыі раёну. Нагадаем, што палякі хацелі яго перавезьці на тэрыторыю амбасады Польшчы ў Менску. Па камэнтары мы зьвярнуліся да вялейскага краязнаўцы Аляксандра Зайцава і ініцыятара збору подпісаў у абарону помніка Аляксея Сюдака (на фота).**



ВІТАЛЬ ПАЎЛОЎСКІ

**— Цяпер, калі пастаноўлена камень не вывозіць, трэба вырашыць, дзе ён будзе стаяць. Якое меркаваньне маюць людзі, што не дазволілі камень вывезьці?**

**Аляксандар Зайцаў:** У Буцьках месца глухое, даехаць туды цяжка. Лепш яго пакінуць на тэрыторыі гораду Вялейкі.

**Аляксей Сюдак:** У парку яго можна паставіць. Другое нармальнае месца — тэрыторыя раённых электрычных сетак (дзе камень і знаходзіцца на сёньня. — **Аўт.**). Там ляжаць ужо камень Ходзькі, жорнаў, камень-сьледавік (камяні валяліся па раёне без нагляду, і таму іх перавезьлі ў горад краязнаўцы). Хай бы часова, 10—20 гадоў, і камень Пілсудзкага паляжаў там. Хаця месца помніка там, дзе яго ўсталявалі адпачаткy, у Буцьках, але на сёньня яго пакінуць у вёсцы нельга. Пілсудзкі — ня наш нацыянальны герой. Зь яго імем зьвязаны не найлепшыя старонкі нашай гісторыі. Але калі стаіць помнік Леніну, то чаму ня можа быць і помніка Пілсудзкаму?

**— Якую карысьць камень можа прынесьці раёну?**

**АС:** Яго можна ўключыць у турыстычны маршрут. Добра было б зрабіць у горадзе алею валуноў. Калі камяні па раёне проста валяюцца, то іх можна прывозіць для такой алеі. І праводзіць экскурсіі.

**— Ня думаеце, што палякі зробяць новыя спробы вярнуць сабе помнік?**

**АЗ:** Цяпер яго не аддадуць, калі ўжо мясцовыя ўлады так вырашылі. А калі б камень перавезьлі, толькі палякі маглі б прыехаць і паглядзець на яго. Для 99% беларусаў ён быў бы закрыты.

**АС:** Я думаю, палякі не захочуць ускладняць сытуацыю.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

# Бунт у Саюзе палякаў

Пра новы скандал у Саюзе палякаў Беларусі паведамляе Pahonia.promedia.by. 30 лістапада ў Тадэвуша Кручкоўскага (**на здымку**) скончыўся тэрмін кіраваньня Саюзам, аднак пра выбарчы зьезд ані чутак. Найвышэйшая Рада СПБ сабралася 20 лістапада, каб прызначыць дату зьезду (абралі канец лютага — пачатак сакавіка), ды лідэры мясцовых арганізацыяў запатрабавалі адстаўкі Т.Кручкоўскага. Той з прыхільнікамі пакінуў пасяджэньне. Пасьля пасяджэньня Т.Кручкоўскі найперш настойваў на звальненьні свайго намесьніка Юзафа Пажэцкага. Ю.Пажэцкі выказаў недавер кіраўніку і заявіў, што сыдзе ў адстаўку, калі тое ж зробіць і старшыня. Т.Кручкоўскі, паводле зьвестак выданьня, лічыць, што Ю.Пажэцкі сышоў у адстаўку. Наступнымі ў чарзе на звальненьне «Пагоня» называе старшыню Гарадзенскай філіі СПБ Мечыслава Яскевіча і сябру Найвышэйшай Рады Анжаліку Борыс.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**АШ**

# Пара думак, народжаных старым фатаздымкам

## Адбудова старой сталіцы магла б стаць агульнанацыянальным праектам

Зьміцер Бартосік

**Нядаўна я ўбачыў фатаздымак прыгожага эўрапейскага гораду, зроблены з вышыні птушынага палёту. Зьвілістыя вуліцы сьцякаліся да вялікага пляцу, на якім дамінаваў велічны сабор са званіцаю. Я нават не адразу зразумеў, што гэта Менск, настолькі ён быў непадобны да самога сябе. Падказку я знайшоў у будынку Марыінскага касьцёлу на плошчы Свабоды. У астатнім горад з вышыні нагадваў хутчэй сёньняшнюю Вільню. Здымак быў зроблены нямецкім лётчыкам 25 чэрвеня 1941 г., на чацьвёрты дзень вайны. Нават пасьля жудаснай нямецкай бамбардзіроўкі горад захаваў сваю старую пляніроўку — які кантраст зь сёньняшняй пусткай. Якім горадам мы маглі б валодаць сёньня! Адчуваеш чарговы прылів цiхай нянавісьці да сучаснага Мінску — савецкага манумэнту без сваіх легендаў і паэтаў.**


АРХІЎ С. ХАРЭЎСКАГА

«Я люблю горад Мінск». Ніколі ня чуў такой фразы ад масквіча ці віленчука. Упэўнены, што наўрад ці калі-небудзь пачую. Бо жыхар сапраўды вялікага гораду ня будзе, як міласьціну, дарыць хлусьлівыя камплімэнты гораду «несостоявшемуся». Але колькі разоў я чуў прызнаньні ў любові да беларускай сталіцы ад мянчан!.. Пэнсіянэраў, студэнтаў і хатніх гаспадынь. Што яны любяць у Менску, мне таксама вядома. «Чыстыя вуліцы, харошыя магазіны і красівыя зданія». А што яшчэ можа сказаць чалавек, для якога менская зямля — гэта не зямля дзядоў, а ў найлепшым выпадку ўсяго толькі месца для кар'еры? Калі пасьля вайны жыхары гораду руйнавалі кварталы Ніжняга рынку, узрывалі Дамініканскі сабор, трушчылі Халодную сынагогу і дабівалі Нямігу, упэўнены, што рабілі яны гэта з самымі сьветлымі пачуцьцямі. Штобы была красіва і красачна.

Як не бывае Масквы без Арбату, як няма Кіева без Храшчацiку, так і ня будзе Менску безь Нямігі. Ніхто і ніколі мяне не пераканае ў адваротным. Ніводзін «любіцель мінскай чыстаты». Таму калі і пачнецца Менск, любімы сваімі жыхарамі, дык са зьменаў на сваёй самай легендарнай вуліцы.

Калі я назіраю сёньня за будаўніцтвам паркінгу на Нямізе, мне здаецца, што я далёка не адзіны, хто адчувае хваляваньне ад той безгляднасьці, зь якой ламаюцца колішнія падмуркі і выкарчоўваюцца старыя дрэвы. Ад той зацятасьці, зь якой бульдозэры капаюць катлаван побач зь месцам, дзе была Халодная сынагога. Ад усёй гэтай тупой дзелавітасьці і зладжанасьці… Не, не на Нямізе, а на будаўнічай пляцоўцы, на аб'екце, які трэба хутка здаваць, на аб'екце, на якім ня можа быць легендаў і містыкі, бо на рабочым месцы не бывае нічога старога і добрага. Сёньня тут могуць быць толькі своечасова не падвезены бэтон, мацюкі прараба і прэміяльныя. Заўтра тут павінен быць красівы гараж і многа крутых крамаў са шмоткамі і жратвой. Адкрыта парушаецца закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, падпісаны спадаром Лукашэнкам. Ніяк не рэагуе пракуратура. Ні аб чым не хвалюецца Дзяржкантроль. Занадта дробная, напэўна, для іх праблемка, каб неяк рэагаваць. Цікава, а колькі ў Менску чалавек, якім гэтае будаўніцтва неабыякава? Пяць ці дзесяць?..

Калі гартаю фотаальбомы, на якіх адлюстраваны даваенны Менск, у мяне ўзьнікае вострае шкадаваньне. Ад таго, што не пасьпеў яго ўбачыць такім, якім яго стварыла гісторыя, і ад таго, што ня ўбачу яго аднаўленьня. А аднаўляць яго ўсё роўна прыйдзецца. Праз сто гадоў ці праз дзьвесьце. Бяз гэтага аднаўленьня Менск застанецца ўсяго толькі адміністрацыйным цэнтрам РБ, але не сталіцаю. Можна памарыць, які гэта можа быць фантастычны агульнанацыянальны праект — адбудова старой сталіцы.

Адзін мой сябар-архітэктар выказаў слушную думку: да рэгенэрацыі Старога гораду нельга падпускаць архітэктараў. Гэтай пачэснай справаю павінны займацца бюракраты і чыноўнікі з законам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны і з дэталёвым плянам кожнага страчанага будынку. Па грандыёзнасьці і маштабе тое будаўніцтва можа пераўзысьці паваеннае перараджэньне сталіцы БССР.

Спрабую ўявіць той будучы горад, які аднойчы вернецца на сваё спрадвечнае месца. Са станцыі мэтро «Няміга» я трапляю не на пустыр паміж пуцеправодам і «Працоўнымі рэзэрвамі», я выходжу сярод шчыльнай забудовы вуліцы Падзамкавай. З-за чарапічных дахаў не відаць каробак праспэкту Машэрава, куды з падземнага тунэлю нясецца аўтамабільны праспэкт. Няма ні сёньняшняга мосту над Нямігаю, ні Дому мадэляў, ні жылога будынку з магазынам «Алеся». Ад Траецкай гары да Раманаўскай слабады, ад Ратушнага пляцу да Палацу спорту раскінуўся адзіны Стары горад. Горад-музэй, вызвалены ад машын і спарудаў XX ст. Горад пакручастай Казьмадзям'янаўскай вуліцы і новай старой Нямігі. Горад, дзе і касьцёл баніфратаў, і кожная камяніца ад моманту свайго аднаўленьня — сапраўдныя помнікі, бо ад раскопак фундамэнту да пакладзенай апошняй цагліны яны аднаўляліся з той рупнасьцю і дакладнасьцю, зь якой рэстаўруюць старыя палотны.

Горад, дзе жыцьцё не замірае ні на сэкунду, лашчачы слых гітарамі вулічных музыкаў, запальваючы цікаўнасьць афішамі мастацкіх галерэяў, дражнячы фантазію кожным новым крутым паваротам вулічнага лябірынту ды абуджаючы апэтыт пахамі з падвалаў-рэстаранаў.

Вузкія пешаходныя вуліцы з навюткімі дамкамі, здаецца, старэюць і сталеюць не па днях, а па хвілінах, з кожным днём вяртаючы сабе шарм даўніны, такой незвычайнай, доўгачаканай і жаданай у Менску. Горад унікальных кавярань, дзе што ні страва — то кулінарны шэдэўр зь «Літоўскай гаспадыні». Горад шматлікіх джаз-клюбаў, тэатраў-вар'етэ і паэтычных пляцовак. Горад найцікавейшых тэатральных і музычных фэстываляў, чыёй афішы могуць пазайздросьціць Эдынбург і Масква. Горад, у межах якога людзі перамяшчаюцца на рамізьніках. Горад, жыхары якога могуць сьмела запрашаць пагасьцяваць да сябе на дзянёк-другі бэрлінцаў і парыжан і ў якім бэрлінцы і парыжане на гадзіну становяцца такімі самымі менчукамі, як і турысты з Шабаноў і Серабранкі…

# Што аднаўляць найперш?

**Адказваюць Захар Шыбека, Уладзімер Гілеп, Уладзімер Дзянісаў.**

Якім павінен быць цэнтар Менску пасьля абвешчанага аднаўленьня? Пра гэта, мабыць, найлепей раcпавядуць людзі, якія ведаюць, якім цэнтар сталіцы быў некалі раней. Пра свае бачаньне рэстаўраванага Менску для «НН» расказалі знаўцы пытаньня — гісторыкі й археолягі: доктар гісторыі Захар Шыбека, старшыня ГА «Беларускі фонд культуры» Ўладзімер Гілеп і старшыня Менскага таварыства аховы помнікаў гісторыі й культуры Ўладзімер Дзянісаў.

«Старадаўні вобраз гораду, — расказвае Захар Шыбека, — фармаваўся на аснове храмавых вэртыкаляў — вежаў, званіц. Іх і варта аднаўляць перадусім».

Пералік храмаў, якія неабходна аднавіць, Шыбека пачынае з базыльянскага Сьвятадухавага сабору, пазьней перaробленага ў праваслаўны Петрапаўлаўскі. Храм стаяў на пляцы Волі, леваруч ад Дому прафсаюзаў. Першачарговым аб'ектам для аднаўленьня называюць гэты сабор і Дзянісаў, і Гілеп.

«Каля кінатэатру «Перамога», — працягвае Шыбека, — неабходна ўзнавіць кляштар бэнэдыктынак (пазьнейшы Праабражэнскі жаночы манастыр)».

Працяг на старонцы 9.



Якім мусіць быць цэнтар сталіцы? Якія гістарычныя помнікі павінны быць адноўленыя ў першую чаргу?

АРТУР КЛІНАЎ

# Гораду і сьвету

## Цэнтар Менску — цэнтар Беларусі

Сяргей Харэўскі

Вы даўно бывалі ў менскім Верхнім месьце? Прайдзіцеся якнебудзь надвячоркам, паглядзіце, як яно патанае ў чорным сутоньні, як змаўкаюць гукі і гасьне сьвятло. Не чуваць дзіцячых галасоў у дварах, не сядзяць суседкі на лавачках, не мігцяць у вокнах мітусьлівым сьвятлом блакітныя экраны. Няма вазонаў на падваконьнях, не лунаюць пахі з кухняў, не трапечацца пад ветрам бялізна. Пуста й мёртва.

З татальным адсяленьнем людзей з гістарычных кварталаў зьнік і іхны самавіты дух. Цяпер там — набор кантораў, а двары пазайманыя машынамі, што шчыльна прыткнутыя адна да адной у разгар будняў. А па выхадных і на сьвяты тут таксама глуха й сумна. Ня будзем зараз спрачацца й пра тое, наколькі маральным было зьнішчэньне бэрнардынскага цьвінтару й выкіданьне костак манахаў, што знайшлі былі тут свой апошні спачын. Але піўнуха на тых самых касьцях — ці ж лепшае выкарыстаньне прасторы старога гораду, агульная плошча якой у Менску — нуль цэлых і некалькі сотых ад агульнае плошчы сталіцы? Падумаўшы, мо было варта нарэзаць у былых гандлёвых радах памяшканьні для розных шапікаў і ятак — кніжных, прамтаварных, прадуктовых, як і было спрадвеку? Відавочна, патрэба ў колішніх «Віленчукоў» вырасла б стакроць. Прынамсі, было б дзеля чаго там стаць у чаргу. У тым квартале й да сёньня няма ніводнага кіёску. А ўлетку ўладальнікі піўнухі, што завецца максымальна нецікава — «Пивной ресторанъ», заставяць усю плошчу перад ім столікамі з дарагім півам. І гэта пад вокнамі музычнай школы. Заняпад цывілізацыйны — навідавоку. Ну а ў халодную пару тут па-ранейшаму будзе зеўраць пустка.

Такою ж памылкаю будзе будаўніцтва паркінгу на Нямізе. Для выездаў зь яго будуць прасечаныя дадатковыя праезды ў старых дварах. Вакол кварталу вуліцаў Рэвалюцыйнай і Камсамольскай рух аўтамабіляў узрасьце шматкроць. Самая каштоўная частка старога гораду ператворыцца ў звычайны транспартны вузел. У выніку гэты ўчастак гораду стане непрыдатным для адпачынку і здаровага жыцьця.

У дзяржаўны сьпіс квартал над Нямігай быў унесены з фармулёўкай безумоўнага захаваньня будынкаў і збудаваньняў, пляніровачнае структуры, ляндшафту і культурнага пласту на ўсёй тэрыторыі ўздоўж тых вуліцаў і прылеглае тэрыторыі. Паркінг, аднак, упарта будуюць, насуперак самому прызначэньню старых кварталаў, якія не пад паркінгі трэба ўжываць.

Выкарыстаньне касьцёлу Сьвятога Язэпа, пад сьценамі якога паселі шаноўныя аматары выпіць, таксама не стасуецца зь ягоным прызначэньнем. Усе сьвятыні ўжо даўно час вяртаць вернікам, разам з кляштарам айцоў бэрнардынаў, дзе й да сёньня за калючым дротам і кратамі — вайсковая вязьніца. Колькасьць ахвотных наведаць адноўлены касьцёл, дзе зьбераглося старадаўняе ўбраньне, была б куды большай, чым колькасьць тых, хто сёньня ходзіць туды ў архіў. Гэтаксама даўно было варта прапанаваць вернікам пляцоўкі, дзе зьбераглісь аўтэнтычныя падмуркі й руіны сьценаў, дзеля аднаўленьня сьвятыняў. Напрыклад: ад касьцёлу Сьвятога Яна Божага, дзе зьберагаўся цудадзейны абраз Маці Божай, з кляштарам баніфратаў, што былі дашчэнту разбураныя падчас апошняе вайны; ад былой царквы Сьвятога Духа, зьнішчанай у 1938-м, з брамаю й часткай манастыра; ад касьцёлу Сьвятога Тамаша, узарванага ў 1951-м, з дамініканскім кляштарам і сэмінарыяй, зь пекнай брамаю-званіцаю ў духу ракако; ад кляштару бэнэдыктынак, зьнішчанага ў 1960-я гады; ад «Белае царквы» самага старажытнага менскага манастыра Ўзьнясеньня, што месьцілася на гары ў раёне Міністэрства абароны й дала назву самой вуліцы Белацаркоўнай (цяпер Камуністычная (!) ды вялікага Казанскага сабору на цяперашнім пляцы Мясьнікова. Усе яны добра ведамыя адмыслоўцам, па іх засталася багатая дакумэнтацыя й іканаграфія. А таму справа іх аднаўленьня ня можа выклікаць вялікіх мэтадалягічных спрэчак.

Неабавязкова адразу ж брацца за такія сур'ёзныя ўзнаўленьні. Вось што рэальна зрабіць за год, дык гэта аднавіць паўтузіну гістарычных капліцаў на іх колішніх месцах: Аляксандраўскую ў аднайменным сквэры ля тэатру, у памяць ахвяраў Курлоўскага расстрэлу на Прывакзальнай плошчы, капліцу ў цэнтры цяперашняе плошчы Мясьнікова, мэмарыяльную капліцу ў памяць бітвы на Нямізе, Юбілейную, у гонар Нікейскага сабору 787 году, што дала назву вядомай плошчы. Нізка гэтых капліцаў нібы ружанцам будзе спавіваць межы старажытнага цэнтру сталіцы й прыўносіць адчуваньне духоўнае і гістарычнае прывязанасьці да канкрэтных мясьцінаў.

Сёньня панятак «гістарычны цэнтар Менску», на жаль, не акрэсьлівае непарыўнай горадабудаўнічай прасторы. Замчышча ўяўляе сабой часткова забудаваную па вайне тэрыторыю, дзе выпадкова ацалелі ўчасткі культурнага слою. Спрэчны вобраз сучасных кварталаў Траецкага прадмесьця склаўся ў выніку перабудовы гістарычнага кварталу, але нядаўна былі зьнесены будынкі, што выпадкова ня трапілі ў рэканструяваны комплекс. Побач зь ім разьмешчана тэрыторыя былога Траецкага манастыра, дзе яшчэ захаваўся сам кляштарны корпус канца XVIII ст., іншыя будынкі, пастаўленыя яшчэ ў 40-я гады XIX ст. Ракаўскае прадмесьце таксама ацалела часткова. Найбольш суцэльную забудову да нядаўняга часу захаваў быў Верхні горад. Паасобна раскіданы па ўсім Менску й іншыя архітэктурна-гістарычныя комплексы…

«Астраўная» структура гістарычнага цэнтру Менску вымагае незвычайных падыходаў да выкананьня мерапрыемстваў па зьберажэньні старасьвеччыны ў сталіцы. Перадусім трэба злучыць тыя гістарычныя самавітыя «выспы» ў адзіны ансамбаль. І бяз зносу малакаштоўных будынкаў сярэдзіны XX ст. не абысьціся. Сама проста — гэта прыбраць найперш будынак колішняга «Белпрампраекту», што завіс над Нямігаю, перад мостам, затым прыбраць і маральна й эстэтычна неадпаведны будынак Дому мадэляў з рогу Нямігі і Машэрава. Гэткім чынам візуальна зьвяжуцца ў адзінае цэлае Ракаўскае і Замчышча, Няміга і Верхні горад. А на пустцы ад Нямігі да Замкавай ідэальна было б разьмясьціць тэматычны гістарычны парк для дзяцей і дарослых. Найперш для дзяцей, якім у гістарычнай частцы ня выдаткавалі нічога.

Зрэшты, абдзеленыя сёньня тут ня толькі дзеці, але й старыя, людзі з абмежаванымі фізычнымі магчымасьцямі, аматары ролікаў і ровараў. Самая галоўная задача пры рэгенэрацыі старога Менску ў падкрэсьленай гуманізацыі асяродзьдзя. У гэтай справе падспрыялі б грамадзкія абмеркаваньні й адкрытыя конкурсы на ўсе праекты, што датычаць гістарычнага цэнтру. Бо цэнтар Менску — гэта цэнтар Беларусі.

Цяпер у афіцыёзным друку ўжо гучаць прапановы й для Замчышча: «...на Машэрава, 2 прапаную стварыць музэй у гэтым будынку, выкарыстоўваючы мадэль Левіна, павялічыўшы яго на адзін паверх, каб зрокава ўраўнаваць з будынкам па Машэрава, 1. «Апрануўшы» музэй у псэўдамэталічныя канструкцыі, можна дабіцца падабенства са старажытнымі беларускімі скрынямі-скарбонамі, якія прызначаліся для захоўваньня розных каштоўнасьцяў. А на самай верхняй пляцоўцы — «накрыўцы» скарбоны — разьмясьціць велізарны макет старажытнага гораду...» (С.Расолька. Дзе павінна знаходзіцца «сэрца» сталіцы? Звязда. 2004. №270 (25283), 10 лістапада). Высьвятляецца, у славутага архітэктара Леаніда Левіна ўжо гатовыя эскізы па ператварэньні будынку «Працоўных рэзэрваў» у музэй.

Выдатная ідэя, плённая. Але навошта павялічваць вышыню гэтага будынку да вышыні будынку на другім баку праспэкту па Машэрава, 1? У такім выпадку рэканструяваны будынак будзе засьціць від з праспэкту на Верхні горад! Не кажу ўжо пра «велізарны макет старажытнага гораду...» на 7 паверсе, патрэба ў якім надуманая.

Зь іншага боку, чаму, напрыклад, разумеючы патрэбу ў пабудове новых гатэляў у цэнтры Менску, не перанесьці пляцоўку пад гатэль «Эўропа» пад музэй вялікай айчыннай вайны? Калі й так пасунулі паводле праекту тую «Эўропу» на 30 мэтраў убок ад сапраўдных падмуркаў, то чаму б не пасунуць яе яшчэ на сотню? Такім чынам, калі дабудаваць той даўгабуд і паставіць новы гатэль на няўдобіцы на месцы «сьцяны Цоя», стары горад будзе «ўпакаваны» гатэлямі ў дастаковай ступені.

Наагул варта прынцыпова аднавіць у старым горадзе ўсяго толькі 5 (!) цывільных будынкаў XVIII ст., якія былі добра ведамыя цяперашняму пакаленьню менчукоў: Малы гасьціны двор з крамамі, аптэку на Казьмадзям'янаўскай, жылы дом з крамамі на першым паверсе на Інтэрнацыянальнай, побач з Палацам Рэспублікі, колішні земскі музэй на месцы танка ля Дому афіцэраў і першы тэатар. Іх клясыцыстычная й ампірная стылістыка лёгка б упісалася ў сёньняшняе атачэньне. Гэтыя будынкі добра вядомыя. Іх аднаўленьне зь вяртаньнем ім колішніх функцыяў ня толькі б упрыгожыла горад, але й сьцьвердзіла б прынцыпы маралі, вышэйшыя над сёньняшнімі бягучымі праблемамі.

Можна яшчэ нават паспрачацца адносна касьцёлу Марыі Магдалены з кармэліцкім кляштарам або пра магчымасьць узнаўленьня баніфрацкага і францішканскага кляштараў. Зусім не абавязкова сьлепа трымацца дакумэнтальнасьці вонкавага аблічча, але абавязкова трэба захаваць сытуацыйную прывязку і маштаб гістарычных рэканстукцый… І катэгарычна трымацца традыцыйных матэрыялаў! Ніякага бэтону, сылікату, плястыку й таннай мэталапластычнай дахоўкі быць тут не павінна. Гэта прынцып, пацьверджаны эўрапейскай рэстаўрацыйнай практыкай.

Калі грамадзтва й улады вырашаць, што неабходна ўзнаўляць гэтыя архітэктурныя дамінанты, якія й рабілі Менск адметным, вылучалі яго сярод іншых гарадоў сьвету, — яны будуць адноўлены, і неабавязкова за год. Толькі трэба ўнесьці гэта ў пляны, праектаваць навабуды з улікам такой пэрспэктывы. А перадусім гэта патрабуе нестандартнага мысьленьня і… любові да гэтага гораду й сваёй справы.

# Што варта ўзнавіць у Менску

**Менск, працярэбліваючы сабе шлях праз палітычныя й эканамічныя перашкоды, пакутліва шукае ўласны вобраз. Як беларуская сталіца можа зьдзівіць сьвет? Хіба што ўразіўшы найперш саміх менчукоў. У менскіх нетрах, проста пад нагамі мінакоў, яшчэ перахоўваюцца незьлічоныя скарбы, неразгаданыя таямніцы, падмуркі й сьцены колішніх славутых бажніцаў дый проста адметных дамоў. Тузін тых страчаных да нашых дзён сьвятыняў ды самавітых цікавостак і ствараў непаўторны вобраз Менску. Што з тых будынкаў яшчэ рэальна аднавіць тамсама, дзе яны былі?**



## Бажніцы й кляштары, капліцы й дамы XVII–XIX ст.

1. Касьцёл Сьвятога Яна Божага з кляштарам баніфратаў.
2. Царква Сьвятога Духа з брамаю й часткаю базыльянскага манастыра.
3. Касьцёл Сьвятога Тамаша з дамініканскім кляштарам і брамаю-званіцаю.
4. Касьцёл Сьвятога Войцаха і кляштар бэнэдыктынак.
5. «Белая царква» Сьвятога Ўзьнясеньня.
6. Сьвята-Казанскі сабор.
7. Кляштар францішканаў.
8. Кляштар кармэлітаў.
9. Кляштар бэнэдыктынаў.
10. Сьвята-Аляксандраўская капліца.
11. Мэмарыяльны крыж у памяць ахвяраў Курлоўскага расстрэлу.
12. Капліца Маці Божае Казанскае.
13. Мэмарыяльная капліца ў памяць бітвы на Нямізе, магчыма, XVII ст.
14. Юбілейная капліца ў гонар Нікейскага царкоўнага сабору.
15. Капліца архангела Міхаіла пры Пішчалаўскім замку.
16. Малы гасьціны двор з крамамі.
17. Дом бурмістра Яна Байкова, колішні першы тэатар.
18. Аптэка на Казьмадзям'янаўскай.
19. Гарадзкі палац на былой Валоскай.
20. Земскі музэй.
21. «Casino», дом Гейдукевіча.

# Менская саха



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Дзе месца для кварталу чырвоных ліхтароў?

**Менск — эўрапейская сталіца. Гэтая фраза ўсё часьцей і часьцей гучыць з вуснаў афіцыёзу. Які сэнс укладаюць у гэтую фразу чыноўнікі, здагадацца няцяжка. Плён іхнага разуменьня бачыць кожны жыхар і госьць сталіцы. Гэта чысьціня вайсковага пляцу і падсьвечаныя фасады. Але эўрапейскіх сталіц не бывае бяз бруду. Яркага і прынаднага. Бруду сэкс-шопаў, гей-клюбаў, піп-шоў і бардэляў. Бруду Соха і пляца Пігаль. У паваенным манумэнтальным Менску ёсьць месца для жытла, для працы, для шпацыру, але толькі не для плоцевага адпачынку. Цікава, што сказалі б архітэктары-дойліды 1950-х, калі б даведаліся, што самая знакамітая стаянка прастытутак месьціцца ля падножжа манумэнта Перамогі? Гэтая група дзяўчат часам нагадвае несанкцыянаваны ўладамі пікет, які, аднак, ніхто не зьбіраецца разганяць. А дзе ж у Менску можа быць квартал чырвоных ліхтароў?**

**Валянцін Акудовіч, філёзаф**: Ня цэнтар Менску. Гэта не для нашай мэнтальнасьці. Хіба дзе-небудзь на ўскраіне. Я б гэта бачыў дзе-небудзь у аддаленьні ад Менску. Ну, скажам, у раёне Цьнянкі. Квартал аднапавярховых домікаў, вёска чырвоных ліхтароў.

**Міхал Анемпадыстаў, мастак**: Традыцыйна квартал чырвоных ліхтароў быў на вуліцы Чырвонай. Яна таму так і называецца. Гэта старая, дарэвалюцыйная назва. Таму на новае месца пераводзіць я ня бачу сэнсу.

**Алесь Анціпенка, філёзаф**: На вуліцы Чырваназорнай. Назва такая і дужа спакойны такі, прывабны, рамантычны закуток гораду.

**Лявон Вольскі, музыка**: На праспэкце Машэрава, у раёне «Юбілейкі». Бо гэта вядомая стомэтроўка.

**Адам Глёбус, пісьменьнік**: Папершае, дзе ў нас што ёсьць? Калі ў нас у рэстарацыях дзеўкі танцуюць, то тут узьнікае пытаньне — дзе мы можам гэта сканцэнтраваць. Хутчэй за ўсё, гэта вуліца Карла Маркса. Гэта вуліца павінна быць у цэнтры, каб да яе можна было пешкі дайсьці. І не на праспэкце. А хто папрэцца на Машэрава? Можна, вядома, наагул зрабіць рэзэрвацыю ў раёне кінатэатру «Аўрора». Але гэта не вырашае праблемы. Усё роўна ўсе дзеўкі стаяць у мяне на плошчы Перамогі.

**Леанід Дранько-Майсюк, паэт**: На беразе Сьвіслачы, з тыльнага боку цырку. Вельмі ўтульная мясьціна.

**Алег Дашкевіч, кінарэжысэр**: Не на цэнтральнай магістралі сталіцы, а ў тых раёнах, дзе шмат беспрацоўных паненак. Напрыклад, у раёне камвольнага камбінату. Гэта дало б ім нейкі дадатковы легальны заробак.

**Артур Клінаў, мастак**: Такое месца мусіць быць збудаванае нанава. Бо такі квартал чырвоных ліхтароў, на мой погляд, ня ўпісваецца ў тое, што ёсьць цяпер. Я ня вядаю, куды яго можна ўціснуць у існуючую структуру. Гэта мусіў бы паўстаць такі спэцыяльны сэкс-забаўляльны комплекс, спэцыяльна збудаваны пад гэтую сэкс-індустрыю. Ён мусіць быць, натуральна, недзе ў цэнтры. Такі комплекс мог бы заняць прастору аднаго са шматлікіх менскіх пустыроў. Я думаю, што гэта магло б быць месца за гатэлем «Беларусь», дзе была старая фабрыка, ці ў раёне вуліцы Кастрычніцкая.

**Кірыла Насаеў, кіраўнік хору «Унія»**: Калі б гэта было яшчэ да будаўніцтваў апошніх дзесяцігодзьдзяў, самае такое кляснае месца існавала гадоў дваццаць таму — гэта Татарскія агароды, калі старыя дамкі стаялі за Нямігай. Гэты кавалачак. Быццам бы цэнтар, але ён закрыты з праспэкту Машэрава. І яшчэ гадоў 15 таму там былі такія вулачкі дзіўныя, старыя дамы, яшчэ драўляныя, двух- і трохпавярховыя. Гэта раён вуліцы Шпалернай…

**Гутарыў Зьміцер Бартосік**



АРТУР КЛІНАЎ

# Што аднаўляць найперш?

**Працяг са старонкі 6.**

У раёне плошчы Мясьнікова — узнавіць Казанскую царкву, пабудаваную ў 1890 г. і ўзарваную ў савецкі час. У раёне скрыжаваньня вуліц Лібкнэхта і Каржа — лютэранскую царкву Сьвятога Мікалая 1862 г.

Гісторык лічыць, што ня варта абмяжоўвацца ўзнаўленьнем толькі хрысьціянскіх храмаў. Неабходным кампанэнтам аднаўленьня храмавай прасторы Менску Шыбека называе мячэт у раёне гатэлю «Юбілейны» і харальную сынагогу на Валадарскага.

Разам з аднаўленьнем храмаў Шыбека мяркуе неабходным аднаўляць і прастору вакол іх: «Пры Марыінскім езуіцкім касьцёле была ж і школа. Чаму не аднавіць будынак езуіцкага калегіюму, які стаіць побач з касьцёлам?»

Уладзімер Гілеп свой пералік адноўленых будынкаў Менску таксама пачаў з храмаў — дамініканскага кляштару 1605 г., першага мураванага будынку ў Менску: «Падмуркі дамініканскага касьцёлу закансэрваваныя й прымыкаюць да Палацу Рэспублікі. Сваім часам іх раскопваў Пазьняк, і я ўдзельнічаў у тых раскопках. Тады іх закансэрвавалі так, каб можна было адкрыць і музэефікаваць. Быў распрацаваны праект музэефікацыі, які зрабіла тая самая група архітэктараў, што праектавала і Палац Рэспублікі.

«Цацачкай», на думку Гілепа, будзе і адноўленая Праабражэнская царква (былы касьцёл бэнэдыктынак) каля кінатэатру «Перамога»: «Яна невялічкая па памеры й якраз бы туды ўпісалася».

Старшыню БФК турбуе й аднаўленьне знакавых будынкаў, якія сьведчылі б пра культавыя мясьціны беларускай гісторыі й культуры. Па-першае, трэба аднавіць дом, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч (скрыжаваньне вуліц Багдановіча й Старажоўскай).

**Працяг на старонцы 11.**

# Кінаабліччы Менску

Менску не шанцавала на кінавыявы. Часьцей ён падаваўся разбураным, збамбаваным, і толькі руіны стралялі ў чарговага акупанта.

Мірнае жыцьцё ўвасобілася асобнымі дворыкамі з чысьценькімі клюмбамі, якія зьніклі яшчэ ў 60-я гады — але захаваліся ў лёгкай карціне **«Нашы суседзі»**. Старыя будынкі засталіся і ў фільме **«Каханая»**, які дасюль зьдзіўляе месьцічаў забытымі гарадзкімі пэйзажамі.

Але горад зьмяняўся, старанна зьнішчаў мінуўшчыну й набываў новую аўру. Гэта шыкоўная й падмеценая аўра абарончага імпэрскага гораду, упрыгожаная сталінскімі карункамі й каляровым гіпсам гастраному «Цэнтральны».

У нетрах гэтага гораду хаваецца страх і адасобленасьць, што было выдатна схоплена рэжысэрам Мікалаем Лебедзевым. Ляндшафты зь ценямі, трамваямі й мурам атрымалі плоць і кроў маньячнага трылеру **«Паклоньнік»**, а галоўная бойка з кінавар'ятам адбылася на даху знакамітае вакзальнае вежы.

Расейскія рэжысэры ўвогуле ўпадабалі Менск у якасьці месца здымак. Але ў выніку горад адбіраецца ў месьцічаў і незаўважна прыпісваецца Расеі — ці якой іншай краіне.

У свой час нястомны экспэрымэнтатар Куляшоў давёў, як можна ствараць новую геаграфічную прастору. Праз мантаж прыступкі храму Хрыста-збавіцеля і набярэжная Масквы-ракі ператвараліся ў ляндшафты Вашынгтону.

Беларускія пэйзажы ў шматлікіх «Каменскіх» набываюць характар расейскага правінцыйнага гарадка. У суседнім са мною доме старанна здымалі сцэну забойства: утульны домік 1950-х гадоў пасуе для крывавых злачынстваў.

У «Ракаўскім бровары» атруцілі аднаго з герояў **«Каменскай»**, а Траецкае прадмесьце набыло статус глухога мястэчка, дзе здымаюцца падпольныя парнафільмы.

Тое самае Траецкае сталася заходнеэўрапейскім гарадком, дзе блазнуюць прыдуркаватыя героі **«Альхімікаў»** Зьмітра Астрахана.

Прадусар Мэнахем Голан, вядомы каньюнктурнай стужкай пра Джані Вэрсачы й паўторам клясыкі «Ноч жывых мерцьвякоў», таксама шмат здымаў у Менску — тут яго прываблівала танная працоўная сіла.

У зомбі-горад Менск не ператварыўся (хаця для гэтага маюцца ўсе кінападставы), але стаўся сталіцаю Пэру — Лімай, дзе адбываўся захоп закладнікаў.

Чужым увесь час рабілі Менск і самі беларускія аўтары. Так, у карціне Міхаіла Пташука **«Гульня ўяўленьня»** пра Менск шмат гаворыцца, але сама сталіца Беларусі выглядае ў фільме каляніяльным дадаткам да расейскае мэлядрамы.

Сваё — і новае — кінааблічча Менску зьявіцца з новымі фільмамі.

**Андрэй Расінскі**

Якім я хацеў бы бачыць гістарычны цэнтар Менску?

# У мяне ёсьць свой праект

Міхал Анемпадыстаў

Адказам на такое пытаньне можа быць толькі праект, комплексны праект кансэрвацыі, рэстаўрацыі, рэканструкцыі. Пляны, схемы, макеты, эскізы, абмеры, памеры, лічбы, сумы, каштарысы… Але я магу ясна ўявіць свой праект праекту. Мае тэзісы вельмі простыя.

1) Ня будзем сьпяшацца: насьпеў момант, калі трэба спыніцца й задумацца. Што мы хочам мець праз 25 гадоў? Спыніцца — гэта значыць абвясьціць мараторый на ўсе будаўнічыя работы на ўсёй тэрыторыі Старога гораду, апроч работ па кансэрвацыі будынкаў.

2) Пагаворым пра самае складанае: галоўная праблема і загана папярэдняй рэканструкцыі Старога гораду палягае ў тым, што цэласнасьць прасторы гістарычнай забудовы, уключна з рэльефам мясцовасьці і нават самімі будынкамі, не разглядаецца як нешта самакаштоўнае. Рэльеф штучна мяняецца, ацалелыя будынкі руйнуюцца да падмуркаў, на іхным месцы ставяцца (у найлепшым выпадку) фантазіі на тэму таго, што было да руйнаваньня. Ясная рэч, што такі падыход таньнейшы, але справа ня толькі ў гэтым. Шмат хто з архітэктараў не разглядае гістарычную забудову, а тым болей прастору і рэльеф, як нешта каштоўнае ў кантэксце архітэктуры. І, можа быць, у такім кантэксце мае рацыю. Але апроч архітэктурнага ёсьць іншыя кантэксты. Давайце пра гэта гаварыць. Паспрабуем яшчэ і яшчэ давесьці да ведама т.зв. «шырокай грамадзкасьці» тое, што кожны асобны гістарычны будынак, кожная цагліна ў сьцяне, кожнае старое дрэва і кожны камень у бруку, узятыя ўсе разам, уяўляюць для нас вялікую гістарычную, культурную і эстэтычную каштоўнасьць. А яшчэ яны ствараюць тое, што завецца духам гораду. Гэта тое, што нельга стварыць нанава. Гэта можна толькі адчуць, і гэта трэба захаваць.



АРТУР КЛІНАЎ

3) Назапасім назапашанае — перачытаем напісанае пра Менск Купалам, Пясецкім, Кульбакам і адзначым на віртуальнай мапе гораду віртуальныя цікавосткі. Гэта ня будзе залішнім падчас працы над праектам, гэта спатрэбіцца таксама і пазьней, тады, калі мы будзем прыдумваць назвы для кавярняў, пісаць буклеты для турыстаў. Натуральна, што старыя назвы вуліц трэба вярнуць як мага хутчэй.

4) Паглядзім, што ацалела. Складзем рэестар ацалелых аб'ектаў, правядзем тэхнічную экспэртызу, вызначым тыя аб'екты, якія патрабуюць тэрміновай кансэрвацыі. Заапекуемся ня толькі будынкамі, але і іншымі складнікамі гістарычнага асяродзьдзя — брукам, вулічным асьвятленьнем, старымі дрэвамі ды іншым, калі пашанцуе гэтае іншае знайсьці.

5) Прааналізуем зробленае. Праекты рэканструкцыі гістарычнага цэнтру рабіліся неаднойчы, неаднойчы ўхваляліся і яшчэ болей разоў парушаліся. Што там ня так? Чаму гэтак часта ўносяцца папраўкі? Давайце апублікуем старыя праекты — будзе над чым прызадумацца! Убачым слабыя месцы, калі яны там ёсьць, а таксама паглядзім, што там можна ўзяць добрага і карыснага.

6) Падумаем, чаго не хапае. З улікам папярэдніх плянаў рэканструкцыі падумаем, што са страчанага (і ў якім выглядзе) варта было б узнавіць.

7) Дзе што з навейшага прыбраць. А чаму не? Я б палову дамоў 1960—1970-х зьнёс бы наагул. Стала б прыгажэй і чысьцей.

8) Вызначымся з маштабам: у гістарычным цэнтры павінна быць тое, чаго фатальна не хапае ў Менску, а менавіта суразьмернай чалавеку маштабнасьці. Маштабнасьці будынкаў, рэклям, архітэктуры малых формаў. Урэшце, сам праект павінен мадэлявацца з нізкіх, так бы мовіць, пунктаў. Так, як гэта будзе бачыць звычайны менскі мінак ці нават ніжэйшы за сярэдні рост японскі турыст.

9) Падыскутуем — з улікам вышэйсказанага распрацуем канцэпцыю й эскізы. Надрукуем у прэсе, пакажам на выставе. Абмяркуем і паспрачаемся. Абяром лепшае, прыйдзем да кампрамісу.

10) Візуалізуем: зробім абмеры, накрэсьлім пляны й схемы, напішам тлумачальныя запісы. Выклеім макет. Пабудуем у кампутары аб'ёмную мадэль гістарычнага цэнтру пасьля рэканструкцыі. Правядзём экспэртызы й нарады. Ухвалім канчатковы варыянт, з тым каб болей яго не мяняць. Дашлём кампутарную мадэль гістарычнага цэнтру ў кожную менскую школу, хай ладзяць віртуальныя экскурсіі. З густам і пачуцьцём стылю будзем падбіраць матэрыялы для будаўнічых і фінішных работ. Забудземся на існаваньне мэталічнай дахоўкі й пляcтыкавых шклопакетаў. Калі будзе трэба, наладзім вытворчасьць цэглы ручной фармоўкі, ці што там яшчэ, створым матэрыяльна-тэхнічную базу.

11) Палічым грошы: колькі гэта ўсё нам каштуе, прызадумаемся, падзелім усю колькасьць працы на этапы і пачнём працаваць. Будзем рабіць якасна, так, як гэта ў нас у Эўропе прынята. Па-іншаму мы ня можам.


СЯРГЕЙ КАЖАМЯКІН

**Міхал Анемпадыстаў, дызайнэр і паэт**

# Горад з насельнікамі і водарам

Тодар Кашкурэвіч

У апошнія часы ўзьнікаюць розныя канцэпцыі рэгенэрацыі нашага гораду, але пры тым гучыць адно толькі тэма разьвіцьця турызму і турыстычнага бізнэсу. Шчыра кажучы, калі я гэта чую, мяне пачынае калаціць амаль у прыступе нэрвіцы. Рэч у тым, што культурны вобраз краіны, гораду, зарыентаваны на турыстычную пацяшальнасьць, ня мае нічога супольнага з уласна культурным зьместам, са спрадвечным прызначэньнем намоленых месцаў. Гэта як процілегласьць вонкавага і ўнутранага, як вэктары, зарыентаваныя адзін на забаву, другі на быцьцё, адзін дзеля прыбытку (прытым незалежна, прыедуць яны з Амэрыкі ці з Асіповіч), другі дзеля тубыльцаў.

Маю права прамаўляць гэткія думкі як чалавек, які мае ў сваім родзе пяць пакаленьняў карэнных менчукоў і, разам са сваім братам Ігарам Кашкурэвічам, прысутнічае ў раёне Старога места ўжо болей за 20 гадоў. Супольна з прадстаўнікамі свайго пакаленьня мы напаўнялі сваім жыцьцём, творчасьцю, зьместам невялікую майстэрню, што на Рэвалюцыйнай, былой Койданаўскай вуліцы. Колькі за гэтыя гады тут зарадзілася самых разнастайных культурных ініцыятыў — мастацкіх, літаратурных, філязофскіх, навуковых, фальклёрных, — колькі асоб, што прайшлі праз гэтую прастору, сталі цяпер лідэрамі шматлікіх культурных плыняў…

Але надыходзяць трывожныя часы — нас чакае РЭСТАЎРАЦЫЯ. Што за гэтым? Траецкае прадмесьце, Верхні горад — ужо відавочны таму прыклад. Месцы без душы. Бяз праўды. Сурагат старажытнасьці. Ну навошта, каму патрэбен старажытны горад безь ягоных насельнікаў, без уласьцівага толькі яму водару, нават… без праўдзівых муроў, замененых на штучныя макеты. Навошта стары горад без мастакоў, музыкаў, актораў, без галерэяў і тэатраў, бязь нейкага, дазволю сабе нават заўважыць, анархічнага духу. Горад ствараюць, шмат у чым стыхійна, самі людзі — знаходзяць сабе дзялкі, абжываюць іх, ствараюць жывыя асяродкі. Прыгадайма, наколькі жывым, можа, не найдасканальнейшым, але жывым, быў мастацкі кірмашык у сквэры ля цяперашняе Ратушы. Цяпер жа — стэрыльна і мёртва, хоць адноўленая Ратуша нібыта й цешыць самалюбства неабыякавых да гісторыі гараджанаў.

Часьцяком у старым Менску ўбачыш дзіўныя рэчы: у горадзе, які хоць крыху, але мае гістарычных муроў XVII—XIX ст., рэстаўратары іх жа імітуюць (!) пад старажытнасьць — фасады дамоў XVIII ст. аздабляюць дзікімі камянямі, скляпеністы інтэр'ер кавярні з аўтэнтычнай муроўкай абштукоўваюць італьянскай тэракотавай пліткай пад «даўніну»… І гэта, на жаль, вельмі паказальна для ўсёй сытуацыі ў беларускай культуры, калі на ўсіх узроўнях праўда замяняецца на імітацыю.

Вось жа, не пазнаць і гарадзкой забудовы савецкага імпэрскага пэрыяду, гэтаксама для нас, менчукоў, не пазбаўленай пэўных сэнсаў, сантымэнтаў нават, са сваімі кавярнямі, крамамі, кнігарнямі, булачнымі… Там мы сябравалі, любіліся, ненавідзелі, тварылі і бавіліся. Жылі і перажывалі. Нават пэўны тып пасьляваеннага мянчаніна ўзьнік.

Цяперашні «город-праздник», з падсьветленымі фасадамі (а сёньня ці сьпіцца ўначы жывым экспанатам у гэткім «музэі»?) нібыта не для жыцьця стаў, а для вечнай тусоўкі (?), для турыстаў (?), якіх, дарэчы, амаль няма, затое сьцягвае ў сваё сэрца зусім неўласьці-

Адказваюць дзеячы культуры

# Горад пад сонцам і месяцам

Вольга Бабкова

Я жыву ў Менску ў мясьціне паміж Мядзьвежынам і Грушаўкай, у раёне былой Нямецкай слабады. Ведаю, апроч іншага, дзе ў вялікай колькасьці водзяцца рагатыя сьлімакі і расьце буйная піжма. З аднаго пагорка ў нас відаць выспа Кальварыі, а з другога, яшчэ больш стромкага, бы з карніза, адкрываецца на даляглядзе відзежа Верхняга гораду з рукавом-рэчышчам Нямігі. Белыя стромкія барочныя птушкі па-над Сьвіслаччу… Рушым, дружа!

Дзіўная зьява — час! Нельга двойчы ўвайсьці ў адну і тую ж раку, але ж чуеш, узбоч нас у бок Лютэранскіх могілак з цэнтру гораду коцяць катафалкі і калясьніцы. Тут быў адзіны праезд для жалобных працэсій. Дарога разьбіта ад падвод з цэглай, якую вазілі зь недалёкага цаглянага заводу, таму шлях быў удвая нялёгкі…

Ад пачатку Нямігі да Верхняга гораду пройдземся пешшу, саступаючы дарогу празрыстым натоўпам мінакоў, як у навагоднюю ноч, збочваючы ў суседнія завулкі. Няміга адметная сваімі касазрэзанымі дахамі, бы які дойлід з асалодай папрацаваў


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вольга Бабкова, архівістка, пісьменьніца**




**Панарама Менску. Гравюра зь ляйпцыгскага выданьня «Neue Charte von Pohlen» («Новыя мапы Польшчы»), зробленая, мяркуючы па ракурсе, з даху гатэлю «Беларусь», 1770-я гады.**

зьверху кравецкімі нажніцамі, пакінуўшы зьнізу выгіны арак. Зь іх цьмяных праходаў вее веснавой зямлёй. Шчыльная прастора вулачак дазваляе наблізіць да сябе гукі і пахі з найбліжэйшых камяніц. Музыка з адчыненага акна, паліцы з кнігамі праз жалюзі ў букініста, аптэка, маленькі кінатэатар, майстэрні… Ёсьць куды схавацца ад дажджу, пагаманіць, разгледзець акварэлі на сьцяне кавярні. Паўлавец? Брук паглынае шоргат шынаў нешматлікіх аўто. Ім больш пасуюць шырокія праспэкты.

Вернем у Верхні горад адно трамвай №4, які пасьля прыпынку ля ратушы будзе качіцца, пазвоньваючы, па крутым схіле ўніз да Сьвіслачы па вулачцы Кірылы і Мятода ды мігцець па вечарох двума зялёнымі агеньчыкамі над кабінай кіроўцы. Ён паедзе далей, па мосьце цераз раку, а мы саскочым ля ліпы, той самай, што здаўна расьце ля дому на пляцы Свабоды. Калі ў цэнтры Эўропы ў цэнтры гораду гудуць пчолы над галавой, ёсьць падставы для спадзяваньняў на лепшае! Пчолы — у кароне ліпы, а за тры крокі ад яе каранёў уваход у дзьверы мядовай крамкі, дзе прадаюць найлепшы мёд ад усіх беларускіх пчаляроў.

У лёхі забяромся іншым разам і імпрэзу ў сядзібе Ваньковіча сёньня прапусьцім. Ня хочацца сьпяшацца. Занадта ласкавае сонца і зручнае месца на лаўцы ў зарасьніку шыпшыны ля шурпатай сьцяны старога кляштару.

Б’е гадзіньнік. Але не на ратушы, а на вежы, што ля Катэдры. Яго калісь прывезьлі ў Менск з паддашку старога замку, што ў ваколіцах Койданава. Знайшлі майстра, і цяпер гукі званоў з усіх пяці бажніц на пляцы перагукаюцца з мэлёдыяй старога мэханізму. На адным зь ярусаў вежы — маленькая заля з партрэтамі менскіх зэгармістраў, пачынаючы ад першага вядомага Мікіты, што абслугоўваў ратушны гадзіньнік на самым пачатку XVII ст.

Верх вежы служыць агляднай пляцоўкай. Хто толькі ні пабываў тут да нас! Увесь пляц як на далоні. Цяпер мы вышэйшыя за ліпу! Брук выглядае на рачныя каменьчыкі, Сьвіслач і побач, і далёка. Зблізку можна разгледзець стары зэгар. Рэч у сабе! Захавальнік таямніцы. Зьнізу рух стрэлак незаўважны, колькі ні ўглядайся. Калі ж стаіш поруч, іх крок здаецца схоплены зрокам, але тут жа прыходзіць разуменьне значна больш глыбока прыхаванай тайны. «Сьвет ходзіць калаўротам». Дзіўная зьява — час. Верх гадзіньніка ўпрыгожваюць памайстэрску выкаваныя выявы сонца і месяца. Дарэчы, сонца над горадам хіліцца да захаду. Трэба спускацца, каб засьпець гульню вячэрніх ценяў на вітражах Сьвятадухаўкі, убачыць яе магутны адбітак на бруку, падобны абрысамі да дубовага ліста.

Ёсьць такі момант пры канцы сьветлага дня, калі цені вежы, храмаў тут, у Верхнім горадзе, прыходзяць у рух, выцягваюцца, крыжуюцца, бы стрэлкі іншага гадзіньніка, нерухомеюць і патухаюць, вызваляючы стары горад для іншага часу сутак. Для сутоньня.

## Што аднаўляць найперш?

Працяг са старонкі 9.

Паводле слоў Гілепа, атрымаецца завершаны ансамбаль: музэй Багдановіча, дом, дзе нарадзіўся паэт, і помнік яму: «Гэта ж на паўдня экскурсіі! І нават дакумэнтацыя на аднаўленьне дому Багдановіча ёсьць».

Па-другое, неабходна паставіць на Нямізе помнік першай згадцы пра Менск. «Трэба абавязкова паставіць на Замчышчы».

Трэці аб’ект у выбары Гілепа — падмуркі самай першай менскай царквы XI ст. Яна так і не была дабудаваная, бо ў XII ст. была разбураная. Але ж месца было асьвячонае пад царкву», — адзначае гісторык. Падмуркі, кажа ён, можна адкрыць для агляду (яны залягаюць на глыбіні 80 см), а побач паставіць яшчэ адну царкву.

Завяршыў ён свой сьпіс абаязковых для рэстаўрацыі будынкаў Траецкім кляштарам (цяперашняй 2-й больніцай).

У «шорт-ліст» Уладзімера Дзянісава Траецкі кляштар таксама ўвайшоў: «Там ёсьць як манастырскія будынкі, так і ўнікальны комплекс першай менскай больніцы пачатку XIX ст. Але самае галоўнае — захаваць тое, што ў нас ёсьць!»

Другім помнікам, які чакае аднаўленьня, гісторык лічыць будынак Малога гасьцінага двара (плошча Свабоды, 19/21), зьнесены пры канцы 1990-х. Ён дагэтуль застаецца ў Сьпісе гісторыка-культурнай спадчыны, пад аховай дзяржавы. «Безь яго нават пазасталая частка плошчы цалкам развальваецца», — адзначае ён.

Наагул жа аднаўленьне архітэктурнага ансамблю плошчы Свабоды як гістарычнага цэнтру Менску Дзянісаў лічыць вельмі важным. Ён ухваліў прапанову стварыць транспартны «пракол» ад Нямігі ў бок вуліцы Леніна. Гэта дазволіць аднавіць цэласнасьць ансамблю: «Плошча была разрубленая магістральлю напалам. Акрамя таго, яна прайшла й па тэрыторыі Менскага замчышча, таксама яго разрубіўшы». Пры аднаўленьні цэласнасьці плошчы Свабоды, дарэчы, удасца паставіць гатэль «Эўропа» на месцы колішняга будынку, а таксама аднавіць будынак гарадзкога тэатру. У ім ставіліся ўсе п’есы Дуніна-Марцінкевіча, у тым ліку й «Сялянка», якая лічыцца пачаткам беларускага нацыянальнага тэатру. «Палякі, напрыклад, — кажа Дзянісаў, — даўно стварылі такі транспартны тунэль у раёне Каралеўскага замку ў Варшаве. Так і вырашылі транспартнае пытаньне, і захавалі архітэктуру».

Цяпер у архівах Вільні выяўлены дакладныя красьлюнкі Менскага гарадзкога тэатру: і вонкавы выгляд, і інтэр’еры, схема заляў і г.д. Можна было б аддаць гэты будынак Акадэміі музыкі, якая сёньня «задыхаецца» ад браку плошчаў, арандуе шэраг будынкаў па ўсім горадзе. «Дарэчы, у канцы 1980-х гэтая ідэя аднаўленьня тэатру сур’ёзна абмяркоўвалася, і Акадэмія музыкі выступіла замоўцам праекту», — згадвае архівіст.

Зь іншых прапанаваных ужо сёньня да рэканструкцыі будынкаў Дзянісаў ухваляе аднаўленьне афіцын сядзібы Ваньковіча. Адна з самых прыгожых афіцын знаходзілася каля Сьвіслачы — яна была вельмі рамантычная, мела першы паверх мураваны, другі драўляны.

**Аркадзь Шанскі**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Тодар Кашкурэвіч, мастак і дудар**

выя яму, гораду, сацыяльныя групы, з зусім неадпаведнымі цэнтру гораду стэрэатыпамі паводзінаў, эмоцыямі, маргінальным стылем…

Праблема архітэктурнага аблічча гістарычнае часткі нашага гораду — гэта праблема, якімі мы будзем, як мы будзем жыць, ці будзе гэты горад напоўнены дастойным сэнсам быцьця, ЗЬМЕСТАМ, ці стане ён МЕСТАМ?

Але мы ўсё ж жывём, мусім жыць, мусім мысьліць і марыць. Так, пры маёй нелюбові да рэканструяваных пабудоў я ня буду супраць адбудаваньня Сьвятадухаўскае ўніяцкае бажніцы, кляштараў дамініканцаў ці бэнэдыктынцаў і г.д. Мне цалкам зразумелы і цалкам незразумелы патас маіх сяброў, ініцыятараў гэтых ідэй. Так, хацелася б памарыць-памроіць разам зь імі. Ёсьць што прамовіць, чым падзяліцца, што прапанаваць, чым натхніцца. Але… Не дазволю сабе гэткае раскошы з маральных прычын. На жаль, у апошнія часы адбываецца нейкі бум у галіне рэстаўрацыі гістарычнай архітэктуры, але побач — занядбаныя магілы уладальнікаў гэтых замкаў, маёнткаў. Ня цешыць вылізаны выштукаваны Навагрудак са сваімі рыцарскімі фэстамі пасьля таго, як наведаеш тамтэйшыя могілкі. І такіх местаў і мястэчак — процьма. І ці маральна займацца аднаўленьнем вонкавага архітэктурнага аблічча, калі ніхто ня верне, не адрэстаўруе (бо немагчыма ўжо) ні нам, ні гораду нашых сьвятых мястовых Нэкропаляў — каталіцкіх, праваслаўных, татарскіх, нямецкіх, жыдоўскіх, паганскіх (нават такія былі). А тое — найважнейшая сутнасьць любога гораду, душа, абсалютны, фундамэнтальны сэнс яго быцьця.

А можа, сапраўды наканаваньне Менску — у вечнай пераменлівасьці, абмене, зьмене, «измене»? Можа, гэтая псэўдаэтымалёгія назвы Менску — «мены» — і стала сапраўднай ягонай сутнасьцю? Можа, горад з такой назвай стаў трагічнай, але і сымбалічнай апрычонасьцю для краіны, зрабіўшыся ейнай сталіцай?

Прынамсі, гісторыя сьведчыць пра верагоднасьць гэткіх высноў.

І перш чым думаць пра футурыстычныя праекты рэканструкцыі, рэгенэрацыі і разьвіцьця гораду, кожны неабыякавы і ўдумлівы жыхар нашага места, лічу, мусіць сьпярша вырашыць для сябе экзыстэнцыйную праблему — як жыць зь незваротна, непапраўна страчаным. Можа, лепш пакінуць усё ў памяці? Бо там, у нашай памяці, усё мае быць лепшым, як у дзяцінстве.

Пытаньне рэканструкцыі гістарычнага архітэктурнага аблічча Менску непарыўна зьнітаванае з праблемаю адраджэньня і фармаваньня нацыянальна-культурнай мадэлі, нацыянальнай ідэалёгіі. Менск для беларусаў — гэта пытаньне самасьці.


ВІТАЛЬ ШАРШНЁЎ

# «У гістарычным цэнтры была ліквідаваная прыватная ўласнасьць»

**Уладзімер Парфяновіч адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН» пра свой удзел у адбудове Верхняга гораду і дзеліцца сваімі развагамі наконт таго, што цяпер адбываецца паміж вуліцай Гандлёвай ды Гарадзкім Валам.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Большасьць людзей ведаюць Вас як алімпійскага чэмпіёна ды палітыка. Аднак Вы таксама былі суўладальнікам фірмы «Білім». Чым яна займалася?**

**Уладзімер Парфяновіч:** Фірма «Білім» ствралася ў 1998 г. менавіта для таго, каб узнавіць гістарычную забудову старога гораду. На гэтым полі ўжо працавала іншая кампанія — «Стары Менск». Але ў яе не ставала грошай ды інвэстараў, каб здужаць гэтую працу. Калі «Білім» прапанаваў сваё вырашэньне праблемы, Менскі гарсавет ды гарвыканкам перадалі 4 будынкі ў Верхнім горадзе ва ўласнасьць фірмы. Ды якія там будынкі — разваліны, нават сьценаў не было. У будынку, дзе цяпер чэская амбасада, стаяла толькі адна сьцяна, падпёртая чатырма палкамі. Мы спыталіся ў тагачаснага мэра Ярмошына: што зрабіць са сьцяной? Ён сказаў: зваліць.

Для адбудовы «Білім» адшукаў крэдыты на суму каля $2,5 млн. Акрамя непасрэдна будаўнічых работаў, фірма рэканструявала навакольную тэрыторыю, пабудавала дарогі, камунікацыі агульным коштам больш за $200 тыс. — інакш кажучы, выканала тое, што горад «наклаў» як умову для рэалізацыі гэтага праекту. Усе работы вяліся ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі Камітэту па ахове гістарычных помнікаў.

**«НН»: Мабыць, немалую Вы выставілі арэнду за офісныя плошчы такой якасьці ды яшчэ ў гістарычным цэнтры.**

**УП:** Так, арэндная плата, якую мы бралі, была нашмат большая за тую, якую браў горад у аналягічных месцах. Але ў дзяржбюджэт таксама ішлі высокія падаткі. Мы змаглі пераканаць прыйсьці ў Верхні горад Сусьветны банк, Эўрапейскі банк рэканструкцыі й разьвіцьця, чэскае пасольства. Гэта была нашая праца з канкрэтнымі людзьмі. Гэта прыгожыя будынкі, там ёсьць нават дворык з фантанам. Усё гэта было зроблена спачатку на крэдыты, а потым на сродкі арандатараў. Працаваць было вельмі цяжка, бо над намі ўвесь час вісеў занесены меч «сацыялістычнай справядлівасьці», які, урэшце, нас рубануў: зьвяртаючыся да парляманту й ураду ў 2003 г., Лукашэнка падняў мэра Паўлава ды загадаў, каб ён адабраў усю ўласнасьць у гістарычнай частцы гораду.

> Існуе, сакрэтнае распараджэньне прэзыдэнта, зь якім Камянкоў, старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда, ды Тозік азнаёмілі судзьдзяў, што праводзілі пасяджэньне, вынікам якога была «экспрапрыяцыя» будынкаў у Верхнім горадзе.

Лукашэнка падмануў дэпутатаў, калі заявіў, нібыта мы ўзялі дамы ў дзяржавы ды здалі іх у арэнду. Прабачце, але тады чаму вы самі не здавалі іх у арэнду? Уся справа ў тым, што мы ўзялі разваліны, а пабудавалі дамы. Звычайная справа: нехта будуе гатэль ці офісы, здае ў арэнду ды зарабляе на гэтым грошы. Гэта нармальны цывілізаваны бізнэс, які існуе ва ўсіх краінах сьвету, акрамя Беларусі. Дакладней, ім тут могуць займацца толькі «прапрэзыдэнцкія» структуры.

Першым, ў каго адабралі будынкі, быў «Білім». Існуе, наколькі я ведаю, сакрэтнае распараджэньне прэзыдэнта, зь якім быў азнаёмлены Камянкоў, старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда, ды Тозік. Мне расказвалі, што Камянкоў ды Тозік азнаёмілі з распараджэньнем судзьдзяў, якія праводзілі судовае пасяджэньне, вынікам якога была «экспрапрыяцыя» будынкаў. Копіі гэтага распараджэньня захаваліся. У гістарычным цэнтры была незаконна ліквідаваная прыватная ўласнасьць, без аніякай кампэнсацыі ўладальнікам за тое, што яны адрэстаўравалі. Пасьля гэтага я выйшаў зь фірмы, бо зь «Білімам» так абышліся яшчэ й з-за мяне, з-за маёй пазыцыі ў парлямэнце.

**«НН»: Каб Вас ня «выкінулі» зь Верхняга гораду, што б Вы там зрабілі?**

**УП:** Фірма зьбіралася прыцягнуць інвэстыцыі ды аднавіць вуліцу Гандлёвую — гэта больш за 20 дамкоў, якія стаялі ўздоўж Сьвіслачы. На гэта спатрэбілася б вялікая сума — $20—30 млн, аднак у нас была магчымасьць знайсьці такія інвэстыцыі.

Улада таксама зьбіраецца аднаўляць вуліцу Гандлёвую — у прынцыпе, праект не павінен нічым адрозьнівацца ад таго, якім кіраваліся мы — гэта ж гістарычная забудова. Таму, можа быць, дзяржаве ўсё-такі сьлед было б прыцягнуць свае рэсурсы ў нешта іншае.

**«НН»: Нядаўна Лукашэнка прайшоўся па Верхнім горадзе ды заявіў, што там будзе створаны кавалачак Заходняй Эўропы…**

**УП:** З дарагімі крамамі? Каб людзі маглі падзівіцца на цэны? Ведаеце, што не сказаў Лукашэнка? Ён не прапанаваў паглядзець, якія заробкі ў тых, хто ходзіць па гэтых крамах за мяжой.

Вось, напрыклад, ідэя збудаваць гатэль «Эўропа» і зрабіць у ім пару буцікаў. Вядома, можна дазволіць нейкай «сваёй» фірме заключыць дамову з «Армані», з «Прада» ці нейкай іншай фірмай на пастаўку тавараў з-за мяжы. Але на сёньня нармальны чалавек патраціць 300 даляраў на квіток, 30 на візу, паляціць у Мілян ды набудзе гэтыя рэчы ў чатыры разы таньней. Купляць у беларускіх крамах будуць толькі людзі з абсалютна шалёнымі грашыма.

**«НН»: Што можна зрабіць для таго, каб сапраўды стварыць у Менску куток Заходняй Эўропы?**

**УП:** Пытаньне вельмі складанае з боку падаткаабкладаньня ды гарантыяў бізнэсу. Хто на сёньня можа гарантаваць, ці не адбяруць заўтра маёмасьць, як гэта зрабілі зь фірмамі ад Верхняга гораду да Гарадзкога Валу? Увогуле, каб пабудаваць у Менску Эўропу, трэба зьмяніць мэнталітэт беларуса. Калі рабства ў душы загіне, тады нешта яшчэ зьменіцца.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

## НАВІНЫ СПОРТУ


WWW.MARKUSSOLANDERSBACKSTREET.DE

### Першы мяч Глеба

Першы гол у гэтым сэзоне бундэслігі забіў паўабаронца «Штутгарту» (у мінулым сэзоне на рахунку беларуса было пяць мячоў). У суботу «Штутгарт» перамог «Бохум» — 5:2. Аляксандар у чарговы раз быў прызнаны найлепшым гульцом матчу. Пасьля 16 гульняў швабскі клюб займае 3-е месца і ў наступную суботу, 11 сьнежня, згуляе ў Мюнхене зь лідэрам чэмпіянату — зорнай «Баварыяй». Пачатак у 16.30 паводле менскага часу.

### …І першая шайба Кальцова ў супэрлізе

Беларускі нападнік Канстанцін Кальцоў закінуў першую шайбу ў складзе маскоўскага «Спартака». Гол беларуса дазволіў масквічам унікнуць паразы ў гасьцявым матчы з уфімскім «Салаватам Юлаевым». Форвард «Пітсбургу» на час лакаўту ў НХЛ напачатку перабраўся ў менскае «Дынама», а потым — у Маскву. Праўда, «Спартак» займае 14-е месца з 16-ці і ні на што не прэтэндуе.

### Па Хуану самбрэра

Кубак Дэвіса ў мінулы ўік-энд заваявала зборная Гішпаніі, абыграўшы ў Сэвільі амэрыканцаў 3:2. Напачатку падавалася, што ў гішпанцаў шанцаў мала: у першы дзень прыхварэў іх №2 Хуан Карляс Фэрэра і яго замяніў 18-гадовы Рафаэль Надаль (праўда, 46-я ракетка сьвету). Ён ня толькі не падвёў, але і ў чатырох сэтах з двума тай-брэйкамі зламаў супраціў другой ракеткі сьвету Эндзі Родзіка і фактычна ўжо ў першы дзень вырашыў вынік паядынку.

### Квота на легіянэраў

Беларуская фэдэрацыя футболу ўвяла ліміт на замежных гульцоў. З 2005 г. каманды вышэйшай лігі могуць на сэзон заявіць восем гульцоў, на матч — пяць, а на полі адначасова ня могуць знаходзіцца больш за тры.

На думку БФФ, у Беларусі багата маладых талентаў, якія праз засільле легіянэраў ня самага лепшага гатунку ня могуць прабіцца ў асноўны склад.

### Першы плод за плот

Першы этап Кубку сьвету па біятлёне, што прайшоў у мінулы ўік-энд у нарвэскім Бэйстастолене, быў нешчасьлівы для беларусаў. У індывідуальных гонках мы ня толькі на п'едэстал, але нават у дзясятку ня трапілі. У другой палове тыдня тамсама, толькі цяпер у Халмэнколене, стартуе другі этап. Жывыя трансьляцыі на «Ладзе». У пятніцу — жаночы спрынт (пачатак у 14.10), у суботу — мужчынскі (12.55), у нядзелю — гонкі пераследу (11.55 і 13.55).

### Аранжавы Клічко супраць Уільямса

11 сьнежня ў Лас-Вэгасе адбудзецца бой за неафіцыйны тытул адзінага сапраўднага чэмпіёна сьвету ў цяжкай вазе (вэрсія WBC). Украінец Віталь Клічко выйдзе на рынг супраць дужага брытанца Дэні Ўільямса.

Клічко-старэйшы паабяцаў зьвіцца на арэне ў аранжавых майках — каб падтрымаць Віктара Юшчанку. Тым часам у Інтэрнэце гуляе анэкдот: Віталь Клічко — чэмпіён па вэрсіі WBC, Януковіч — прэзыдэнт паводле вэрсіі VVP і AHL (Пуціна і Лукашэнкі).

**Алег Раявец**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Беларусы ў бітве за Мантэ-Касіна:** арт., дак. / уклад. Ю.Грыбоўскага; прадм. Х.Кажаневіча. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 124 с. 300 ас. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны, кн.2).

У кнізе дасьледуецца гісторыя арміі Андэрса, апублікаваны поўны сьпіс нашых суайчыньнікаў, якія загінулі ў Італіі. Зьмешчаная дакумэнтальная аповесьць Пётры Сыча «Сьмерць і салаўі».

**Бураўкін Генадзь. Жураўліная пара: Вершы канца стагодзьдзя.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 156 с. 1000 ас.

**Выхота Валянціна. Лінгвістычны падыход да перакладу верша Ё.В.Гётэ «Ружачка ў полі».** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 28 с. 150 ас.

**Губарава-Крупская Зінаіда. Краіна чароўных сноў: Казкі**. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 236 с. 340 ас.

**Дзюбак Марыя. Сьветлыя ростані: Вершы.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 128 с. 1000 ас.

**Дранчук В. Белавеская пушча. Рэзалюцыя SOS: Хроніка красы і змаганьня. 1995—2000.** — Менск: Каўчэг, 2004 г. — 302 с., 28 с.: іл. 1000 ас.

**Марцалаў С. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыкляпэдыя. Т.1, кн.1. Гомельская вобласьць** / Рэдкалегія: Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш. — Менск: БелЭн, 2004. — 632 с.: іл. 4000 ас.

Цана 15000.

**Ермашкевіч Б. Навучаньне зямлёй: Вершы.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 136 с. 500 ас.

**Куляшоўскія чытаньні: Матэрыялы міжнароднай навуковай канфэрэнцыі 11—12 сьнежня 2003 г**. Тэзісы дакладаў у 2 ч., ч.1, ч.2. — Магілёў: МДФ імя Куляшова, 2004. — 348 с. 190 ас.

**Куніцкі Зьмітрок. У цянётах часу: Вершы.** — Наваполацак: Цэнтар ГАКАІ «Ўсяслаў Чарадзей». — 2004, 88 с. 150 ас.

**Крукоўскі Мікола. Бляск і трагедыя ідэалу: Філязофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і сувэрэнітэт.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 352 с. 200 ас.

Аўтар далей разьвівае канцэпцыю, запачаткаваную ў ранейшых прысьвечаных эстэтыцы манаграфіях.

**Ліпскі У. Бацька: Пісьмы сына = Отец: Письма сына**. Пер. зь бел. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 256 с. 2000 ас.

**Мой родны край: Матэрыялы студэнцкай навукова-практычнай канфэрэнцыі 30 красавіка 2004 г., Менск.** — Менск: БДПУ, 2004. — 54 с. 50 ас.

**Тарас Валянцін. На высьпе ўспамінаў: мэмуары.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 344 с.

Успаміны пісьменьніка В.Тараса ахопліваюць пэрыяд прыкладна з 1934 г. да нашых дзён. Другая сусьветная вайна, акупацыя Беларусі, партызанскі атрад, першыя пасьляваенныя гады, лёсавызначальныя 1980—1990-я, журналісцкі і пісьменьніцкі асяродкі далёкіх і блізкіх гадоў — такая прастора кнігі.

**Сяргей Лескець**

# «Мы ўсе недаацанілі ўкраінцаў»

**— Галоўнае адрозьненьне паміж беларускай ды ўкраінскай сытуацыяй у тым, што ў Беларусі не сфармаваўся алігархічны плюралізм, — мяркуе вядомы ўкраінскі сацыёляг Мікола Рабчук. — У вас праблема зьменаў упіраецца ў аднаго чалавека.**


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**«НН»: Вы нядаўна пабывалі зь лекцыямі ў Міляне, Парыжы, Варшаве. Як Вы адказвалі замежнікам на пытаньне пра тое, што адбываецца ва Ўкраіне?**

**Мікола Рабчук:** Перш за ўсё, мне часьцяком даводзілася тлумачыць, што такое Ўкраіна. Для тых, хто гэта ўжо ведаў, я мусіў абвяргаць спрошчаны стэрэатып пра яе падзел на дзьве часткі. Насамрэч яна складаецца з многіх частак, але асноўны падзел — ідэалягічны: ёсьць Украіна, якая прагне ў Эўропу, да эўрапейскіх каштоўнасьцяў, і Ўкраіна, якую старая намэнклятура ўпарта чапляе за савецкія каштоўнасьці. Намэнклятуршчыкі зьлякаліся магчымых зьменаў ва Ўкраіне і, не без дапамогі цэнтральнай кіеўскай улады, намагаюцца зьберагчы рэшткі савецкага ладу. Мы маем дзяржаву, якая карыстаецца шантажом і ва ўнутранай, і ў замежнай палітыцы. Чарговы праект такога шантажу — прадставіць справу так, нібыта Ўкраіна расколваецца на дзьве часткі.

**«НН»: Што ж на самай справе адбываецца? Што будзе далей?**

**МР:** Нацыятварэньне набліжаецца да завяршэньня. У апошнія гады, месяцы і асабліва дні мы атрымалі калясальны імпульс нацыятворчай энэргіі. Паглядзіце на Хрышчацік — гэта людзі розных нацыянальнасьцяў, якія гавораць на розных мовах, але іх аб'ядноўвае грамадзянская сьвядомасьць, яны нарэшце пераверылі ў вольную краіну і маюць шанец яе здабыць. Любы прэзыдэнт, калі ён патрыёт, павінен марыць пра гэта — мець аб'яднаных, мабілізаваных грамадзян, якія жадаюць чагосьці дасягнуць. Прэзыдэнт Кучма ўсё сваё праўленьне пакутаваў у пошуках нацыянальнай ідэі: то казаў, што яна не спрацавала, то казаў, што ня можа яе знайсьці. Але ёсьць ужо такая ідэя, толькі трэба аб'ядноўваць, а не разьядноўваць людзей.

Недаацэньвалася разьвіцьцё грамадзянскай супольнасьці ва Ўкраіне, і я сам гэта недаацэньваў, бо бачыў, як цягам апошніх дзесяці год улада пасьлядоўна гэтую супольнасьць зьнішчала, насаджала цынізм — маўляў, нічога ня зьменіш. Але гэтая супольнасьць зьберагласся і гучна сказала сваё слова. Гэта вялікая неспадзяванка для ўсіх — і для ўладаў, і для Масквы, і для Эўропы. Мы ўсе недаацанілі ўкраінцаў — і гэта той выпадак, калі я страшэнна рады, што памыляўся. Сёньня на нашых вачах творыцца сучасная ўкраінская нацыя — не этнічная, а грамадзянская.

**«НН»: Нават на Ўсходзе?**

**МР:** Усход — раён праблемны. Там самагубчая індустрыя — неэкалягічная, састарэлая, зь ёю невядома, што рабіць. Дзякуючы Януковічу, мы маем на Ўсходзе таталітарны лад і таталітарную сьвядомасьць у вялікай колькасьці людзей, якія ня маюць ніякай альтэрнатыўнай інфармацыі. Хаця й асаблівага энтузіязму да ўладаў тыя людзі таксама не выяўляюць: яны проста пакорныя, слухаюцца таго, што кажа мясцовае начальства ды мафія. Штосьці падобнае ўжо было ў нашай гісторыі ў часе нацыянальнавызваленчага змаганьня 1917—1920 г., калі з дапамогай Расеі там спрабавалі арганізаваць антыўкраінскія ўтварэньні накшталт Савецкай Данецка-Крываросскай Рэспублікі. І сёньня мы выразна бачым руку Масквы.

**«НН»: Хто вядзе рэй у супрацьстаяньні дэмакратыі — уласна ўкраінскія ўлады ці Расея?**

**МР:** Кучма доўгі час праводзіў незалежную палітыку, балянсуючы паміж Масквою і Захадам, але пасьля «касэтнага» скандалу ён быў змушаны капітуляваць і сёньня ў вялікай меры ім маніпулюе Масква. Атачэньне Кучмы, найперш кіраўнік ягонай адміністрацыі пан Медзьвядчук, умела маніпулюе фобіямі ды комплексамі Кучмы, праводзячы маскоўскую палітыку. Разам з тым, Кучма мае й пэрсанальныя палітычныя амбіцыі, але ці зможа ён іх рэалізаваць?

**«НН»: Наколькі адэкватна падводзяць сябе ў гэтай сытуацыі расейскія ўлады?**

**МР:** Расея ў вялікай меры памылілася адносна настрояў украінцаў. Ня першы раз, дарэчы. Прыгадваецца масіўная прапаганда супраць незалежнасьці перад рэфэрэндумам у 1991 г. Прайшло 13 гадоў, а Расея надалей застаецца ў палоне сваіх імпэрскіх ілюзій ды верыць, што ўкраінцы сьпяць ды мрояць, як бы вярнуцца ва ўлоньне новай імпэрыі.

> У Беларусі дэмакратычныя зьмены будуць раптоўнымі.

Расейцы моцна пераацэньваюць той факт, што так шмат украінцаў размаўляюць па-расейску. Ім здаецца, што калі на вуліцах Кіева гучыць пераважна расейская мова, дык кіеўцы спрэс расейскія патрыёты ды гатовыя гуляць ролю малодшых братоў. Насамрэч гэта ня так.

**«НН»: Ці лічыце Вы магчымым такі варыянт падзей у Беларусі?**

**МР:** Я зьяўляюся аптымістам адносна Беларусі, і нават некалькі год таму паўжартам казаў, што Беларусь хутчэй зробіцца дэмакратычнай краінай, чым Украіна. У вас таксама ідзе станаўленьне грамадзянскай супольнасьці, уладам не ўдаецца яе зьнішчыць. Беларусь таксама мае праблему моўна-культурнай падзеленасьці. Аднак у Беларусі ня так востра стаіць моўна-культурны падзел, яго цяжэй эксплюатаваць, бо беларуская мова была пасьпяхова маргіналізаваная ўладаю і перастала быць пагрозаю для расейскамоўнай большасьці. Украінскі рэжым пасьпяхова пужае сваіх падданых прымусовай украінізацыяй «пад руляй пісталета», а ў Беларусі такое выглядае занадта фантастычна.

Ва Ўкраіне існуе пэўная карэляцыя паміж дзвьюма ідэалягічнымі праектамі і іх большай ці меншай папулярнасьцю ў рэгіёнах. Аднак чорна-белага падзелу няма — ёсьць спэктар ад аранжавага ў Львове да блакітнага ў Данецку, але тыя колеры перацякаюць з аднаго ў другі, назіраецца дыфузія. У Беларусі, наколькі я разумею, найбольшыя адрозьненьні не паміж захадам ды ўсходам, а паміж сталіцай ды правінцыяй. Ваш прэзыдэнт досыць умела гуляе на гэтым падзеле, ён эксплюатуе настроі правінцыі. Як нармальны калгасьнік, ён зьберагае варожасьць да сталіцы, недавер, пазадронасьць.

У Беларусі аўтарытарны рэжым усталяваўся тады, калі не было ніякай рэальнай прыватызацыі, станаўленьня алігархічнай сыстэмы, з прычыны чаго ён выявіўся дужа савецкім. Ня ўзьнікла таго алігархічнага плюралізму, які ёсьць ва Ўкраіне. У нас сапраўдны аўтарытарызм не ўсталяваўся, бо розныя кланы адстойваюць свае інтарэсы і ў розных сытуацыях могуць быць саюзьнікамі дэмакратычных сіл. У Беларусі гэтага пакуль няма, але гэта не фатальна. Бо з аднаго боку, гэта ўскладняе дэмакратычныя зьмены, а з другога, робіць іх патэнцыйна больш хуткімі, раптоўнымі. У вас праблема зьменаў упіраецца ў вельмі вузкое кола людзей, магчыма, нават у аднаго чалавека.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

## Украінская Ўкраіна й беларуская Беларусь

Найноўшыя ўкраінскія падзеі яшчэ доўга будуць аналізавацца беларускімі палітолягамі й палітыкамі. Сапраўды, каштоўны матэрыял для роздуму.

Тут дарэчы прыдаўся апошні, пяты сёлетні нумар «Arche», у якім расейскамоўныя і беларускамоўныя інтэлектуалы нашай краіны спрачаюцца пра ролю і месца беларускай мовы ў Беларусі.

Падаецца мне, ня варта казаць пра «шэрую, паслухмяную масу», маючы на ўвеце ўкраінскі ўсход, — гэткая мэтафара не зусім тактоўная. І ўсё ж… У адрозьненьне ад захаду, які выступае за дэмакратыю, эўрапейскі вэктар разьвіцьця, дзяржаўнасьць і родную мову, расейскамоўны ўсход выступае супраць… Супраць Юшчанкі, украінскай мовы, паўнацэннай незалежнасьці. Расейскамоўны ўсход дэкляруе аб стварэньні аўтаноміі (ягоная столь палітычнага развою?), да каштоўнасьцяў самастойнай дзяржавы ён абыякавы. Выступаць супраць — ці ёсьць гэта стваральнае імкненьне?

Гледзячы супраць чаго, скажаце вы. Можна выступаць супраць тыраніі, дэспатызму, эканамічнай стагнацыі — ці будзе гэта адмоўным жаданьнем? Не, вядома, калі ўзамен тыраніі будзе прапаноўвацца нешта прагрэсіўнае.

Наяўнасьць нацыянальнага рухавіка ўкраінскай «аранжавай» рэвалюцыі дае нам спадзеў і веру. Калі будзе магчымая ўкраінская Ўкраіна, дык чаму ня быць магчымай беларускай Беларусі?

**Алесь Аркуш, Полацак**

## Зварот пісьменьнікаў да распаўсюдніцкіх арганізацый

Дырэктару РУП «Белсаюздрук» Падгайнаму М.В.
В.а. дырэктара УП «Менгарсаюздрук» Івінскай Т.І.

Шаноўныя кіраўнікі арганізацый, што распаўсюджваюць прэсу!

Зьвяртаемся да Вас з просьбай паспрыяць таму, каб у газэтных шапіках зьявіліся існуючыя літаратурна-мастацкія часопісы «Дзеяслоў» і «Arche-Пачатак». Гэтыя выданьні робяць вялікую справу папулярызацыі беларускага слова, беларускае думкі. Яны працуюць нешаблённа, змагаюцца за сваю аўдыторыю.

Прыкрая недарэчнасьць, што часопісу «Дзеяслоў» было адмоўлена ў заключэньні дамовы на распаўсюд, а дамова на распаўсюд часопіса «Arche-Пачатак» была разарвана ў лістападзе. Між тым вяртаньне часопіса «Arche-Пачатак» па УП «Мінгарсаюздрук» за два апошнія гады не перавышала 20—30%, што вельмі мала нават па эўрапейскіх мерках як для літаратурна-мастацкага выданьня і паказвае на прыбытковасьць распаўсюду інтэлектуальных часопісаў. Калі ж па РУП «Белсаюздрук» вяртаньне часам і будзе большае, дык ці ня варта проста аптымізаваць рэгіянальную раскладку продажу выданьняў ці колькасьць прадаваных асобнікаў? Адсутнасьць часопісу ў продажы азначае, што спажыўцы недзе ў Лідзе ці Лунінцы зусім ня маюць магчымасьці знаёміцца з навінкамі беларускае і сусьветнае літаратуры.

Не рабіце грахоў перад айчынай, перад словам дзядоў і прадзедаў, ашчаджайце і абараняйце беларускае слова! Просім Вас знайсьці магчымасьць, каб у шапіках і крамах зьявіліся літаратурна-мастацкія часопісы «Дзеяслоў» і «Arche-Пачатак».

**Алесь Бадак, Лявон Баршчэўскі, Пётра Васілеўскі, Анатоль Вярцінскі, Алесь Жук, Сяргей Законьнікаў, Васіль Зуёнак, Вольга Іпатава, Анатоль Кудравец, Алесь Масарэнка, Уладзімер Някляеў, Уладзімер Сіўчыкаў, Міхась Скобла, Кастусь Цьвірка**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

25 лістапада **здымачную групу** французскага тэлеканалу **«ARTE»** без тлумачэньняў не прапусьцілі на тэрыторыю Беларусі ў Берасьці, не зважаючы на акрэдытацыю ад беларускага МЗС. 30 лістапада суд пастанавіў аднавіць на Магілёўскім мэталюргічным заводзе сяброў прафсаюзу РЭПАМ **Уладзімера Бялосава** й **Аляксандра Ўсевіча**, незаконна звольненых у верасьні 2004 г. Суд Кастрычніцкага раёну Менску 30 лістапада адмовіў Беларускаму кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў у аднаўленьні на працы авіядыспэтчара РУП «Белаэранавігацыя» **Алега Долбіка**, звольненага 1 кастрычніка. Старшыня «Гарадзенскага выбару» **Зьміцер Іваноўскі** 1 сьнежня асуджаны на 15 сутак за заклік да ўдзелу ў несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў. Уначы з 30 лістапада на 1 сьнежня невядомыя спрабавалі прабрацца ў офіс **АГП**, 2 і 6 сьнежня быў узламаны інтэрнэт-сайт партыі. 1 сьнежня лідэр АГП **Анатоль Лябедзька** атрымаў два пазовы ў пракуратуру: яго меліся дапытаць наконт публікацыі ў польскай «Gazecie Wyborczej» і перадвыбарнай прэс-канфэрэнцыі ў офісе партыі, дзе гаварылася пра фальсыфікацыі. Пінская рэгіянальная друкарня 1 сьнежня адмовілася друкаваць недзяржаўную газэту **«Мясцовы час»**, спасылаючыся на перагружанасьць, пінскае аддзяленьне «Белсаюздруку» адмаўляецца браць газэту на рэалізацыю. Пратэстанцкай царкве **«Слова праўды»** (Койданава) 1 сьнежня адмовілі ў перарэгістрацыі, пастар царквы **Мікалай Козел** зьвязвае адмову са сваім рашэньнем балятавацца ў дэпутаты на мінулых выбарах. Карэспандэнтка «Народнай волі» па Гомельскай вобласьці **Ірына Макавецкая** 2 сьнежня была затрымана ў залі суда за «непавагу да суда», калі адмовілася выканаць незаконнае, на яе думку, патрабаваньне судзьдзі пакінуць судовае пасяджэньне. 3 сьнежня лідэру ПКБ **Сяргею Калякіну** за публікацыю ў «Gazecie Wyborczej» пракуратура вынесла афіцыйнае папярэджаньне. Падчас вывешваньня пляката «Сёньня Ўкраіна, заўтра мы!» 6 сьнежня ў Менску затрыманы непаўналетні актывіст «Зубра» **Аляксандар Маршэўскі**. Назіральнік ад БХК на мінулах выбарах **Уладзімер Амосаў** (Полацак) 6 сьнежня аштрафаваны на дзьве базавыя велічыні за «паклёп на службовую асобу»: падчас папярэдняга галасаваньня 13 кастрычніка ён патэлефанаваў у міліцыю й паведаміў, што старшыня камісіі ў асобным пакоі ўжывае зь сябрамі сьпіртныя напоі. Афіцыйная мэдэкспэртыза алкаголю ў крыві не знайшла. Журналістку **Ірыну Халіп** выклікалі ў пракуратуру 7 сьнежня.

**АШ**

# Невядомы супраціў




**Нонканфармізм у Беларусі. 1953—1985.** Даведнік. Т.1. — Менск, 2004. Аўтар-укладальнік Алег Дзярновіч.

Біяграфіі беларускіх «антысаветчыкаў» — яшчэ адзін штрых да гісторыі Беларусі. Сьвядомыя незалежнікі, культурнікі, дэмакраты, лібэралы, зэкі, праўдалюбцы, яўрэі і баптысты — каго тут толькі няма. Побач зь вядомымі прозьвішчамі Л.Геніюш, З.Пазьняка, М.Чарняўскага, Э.Сабілы, В.Быкава мы сустракаем дзясяткі малавядомых людзей, кожны зь якіх сам сабе выбіраў шлях змаганьня.

Напрыклад, браты Лявон і Міхась Белыя, пляменьнікі Якуба Коласа, якія ў 1957 г. у Менску расклейвалі ўлёткі супраць русіфікацыі Беларусі. Ці група Г.Бурштына, П.Дворака і Я.Лешука, якая ў 1953 г. ў Маларыцкім раёне распаўсюдзіла антысавецкую ўлётку. Ці група А.Грыгор’ева і В.Ракашэвіча, што ў канцы 1950-х гадоў стварылі падпольную Беларускую рэвалюцыйную партыю дзеля ўзброенага змаганьня з савецкай уладай. Ці група С.Ханжанкова, Г.Сярогіна, В.Храпавіцкага, якая ў 1963 г. зьбіралася ўзарваць вышку з радыёглушыцелем у цэнтры Менску. Якія павучальныя прыклады для падручнікаў гісторыі падсавецкай Беларусі!

Пасьля нядаўнай выбарчай кампаніі асаблівую ўвагу прыцягваюць выпадкі пратэсту супраць фальсыфікацый на так званых выбарах, калі за прадстаўнікоў блёку камуністаў і беспартыйных галасавала ня меней 99,8%.

Дык вось, група Антона, Вячаслава і Язэпа Анушкевічаў у Ляхавічах у 1956 г. распаўсюджвала антысавецкія ўлёткі, дзе аўтары, апроч усяго іншага, выкрывалі «фальш выбарчай сыстэмы».

Казак Іван у 1961—1962 гадах у Бабруйску раскідваў улёткі, дзе заклікаў не галасаваць за кандыдатаў-камуністаў.

Выкарысталі выбары для пратэсту і дзьве жыхаркі Докшыцкага раёну Т.Клімашэўская і Н.Паўловіч, якія 18 сакавіка 1961 г. каля выбарчага ўчастку вывесілі плякаты «з антысавецкімі надпісамі».

На што яны спадзяваліся ў тых умовах суцэльнага таталітарызму?.. Бо ўрэшце ўсе яны былі арыштаваныя і асуджаныя, а надалей выключаныя з грамадзкага жыцьця. Мне падаецца, яны проста паводзілі сябе так, як мусіць паводзіць нармальныя людзі ў ненармальных умовах. Іхнія лёсы і лёсы соцень, тысяч такіх, як яны, сталі маральным і гістарычным абгрунтаваньнем тых зьменаў, якія надышлі ў Беларусі на пачатку 1990-х. Яны сваім жыцьцём абверглі фальшывую тэзу пра наскрозь савецкую Беларусь, якая не была гатова да дэмакратычных зьменаў. Яны, апроч усяго, прыклад трываласьці для сёньняшняга грамадзтва.

**Алесь Бяляцкі**

### Апошні канцэрт «Сяброў»

Ансамбаль «Сябры», які сёлета адзначыў сваё 30-годзьдзе, дасьць 11 сьнежня апошні канцэрт. Лідэр калектыву Анатоль Ярмоленка сытуацыю не камэнтуе й кажа, што гледачы пра ўсё даведаюцца на канцэрце.

### На ўшанаваньне памяці Быкава

Віцебская абласная рада БМ адкрыла разьліковы рахунак у банку, праз які мяркуецца зьбіраць сродкі на ўшанаваньне памяці Васіля Быкава. Вось ён: №3015000017823 у віцебскім філіяле №201 ААБ «Беларусбанк», код 259, УНН 300701900.

### «Букер» для Аксёнава

Літаратурную прэмію «Букер — Адкрытая Расея» за найлепшы раман году атрымаў пісьменьнік Васіль Аксёнаў («Вальтэр’янцы й вальтэр’янкі»). Дзея твору адбываецца ў Расіі ў 1764 г., калі імпэратрыцай стала Кацярына ІІ і дыскутаваліся ідэі «лібэральнай імпэрыі».

### Няма Маркавай

Памерла балерына Алісія Маркава (Ліліян Алісія Маркс), якую ўвёў у сьвет балету легендарны Сяргей Дзягілеў. Маркава спрычынілася да стварэньня нацыянальнай балетнай школы Брытаніі: да яе ў Лёндане не было балетнай трупы. У 1940-х танцавала ў ЗША, потым стварыла трупу «Festival Ball» (цяпер «English National Ballet», другую па значнасьці ў Вялікабрытаніі пасьля Каралеўскага балету), у 1960-х кіравала балетнай трупай «Мэтраполітэн-опэра».

**АВ; БелаПАН, «Gazeta.pl»**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Не жартуйце зь юнакамі на дапросах




«Нэйра Дзюбэль» — «Tanki», 2004.

Дыск гатовы, а ў продажы не зьяўляецца — працівяцца нашчадкі народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Справа ў песьні на хрэстаматыйны верш «Камсамольскі білет» («Цьвёрда трымаўся юнак на дапросе…»). Сваякам не спадабалася, што творчасьць белсавецкага клясыка выглядае «жартоўна».

Задума цалкам беларускамоўнай праграмы «Дзюбэлю» паўстала яшчэ на «Рок-каранацыі-2001». «Танкі» — самая гітовая праграма ў 15-гадовай гісторыі гурту: «Гузік», «Беларусь», «Таварыш Чэ», «У.е.», «Жыцьцё»… Кулінковіч мае спадзеў, што апошнюю люд падхопіць так, як у свой час падхапіў «Гумовы дом». «У песьні «Жыцьцё», — расказвае Кулінковіч, — ёсьць такі радок: «Дзесяць год, як я ня свой». Тут маецца на ўвазе не праўленьне нашага прэзыдэнта, а мой асабісты выпадак. Справа ў тым, што нядаўна споўнілася дзесяць год з таго часу, як мне зрабілі цяжкую апэрацыю на мозгу, пасьля якой забаранілі ўжываць алькаголь, глядзець тэлевізар, займацца каханьнем і г.д. Казалі, што магу доўга не пражыць. Гэтая песьня ёсьць сьведчаньнем таго, што Я ЖЫВЫ».

У пачэсны шэраг патрыятычных твораў становіцца і «Беларусь — мая радзіма» — панкаўскі рок-н-рол.

Дыск каштоўны таксама сваімі бонусамі — туды ўвайшлі ранейшыя беларускамоўныя творы ў выкананьні Кулінковіча, некаторыя зь якіх нават не выдаваліся («Папараць кветкі» зь нерэалізаванай «Скрыпкі дрыгвы»).

## Вяртаньне караля




«Žygimont VAZA» — «Каін», 2004.

На сцэну вяртаецца адзін з самых таямнічых гуртоў у беларускім року — «Žygimont VAZA». Гісторыя гурту сягае яшчэ ў «бондаўска-мроеўскія» часы. Шмат каму гурт запомніўся скандальнымі акцыямі, такімі, як «Fucking Communism» у Коўне за савецкімі часамі. Пасьля лідэр калектыву стаў актывістам Партыі аматараў піва і некаторыя яго канцэрты заканчваліся судамі ды пастарункамі, як акцыя «Яны ня пройдуць» у 1994 г., калі камуністы падалі на арганізатараў канцэрту ў суд (скончылася, праўда, усё бяз штрафаў). Акцыя ў 1995 г., прысьвечаная дню Беларускай краёвай абароны 23 лютага, была забаронена Савецкім райвыканкамам, дарэчы, у асобе сп.Калякіна. Хлопцы вырашылі ісьці на прынцып ды перацягнулі апаратуру на балькон кватэры аднаго з удзельнікаў, далі канцэрт і… апынуліся ў пастарунку.

У другой палове 1990-х «Žygimont VAZA» зьнік з музычнага далягляду. Як зазначаюць самі ўдзельнікі групы, яны пасьля ганебнага рэфэрэндуму перажылі пэўную трансфармацыю сьвядомасьці, што вылілася ў запавольваньне музычнае думкі. І вось нарэшце «кароль» вяртаецца з новымі песьнямі, новым альбомам, запісаным новым складам.

Першая думка, якую спараджае «Каін», — што гэта сумесны праект «Крамы» і «Ўлісу», аднак далей слухач ужо канчаткова трапляе на вірлівую «жыгімонтаўскую» хвалю. Што да тэкстаў, дык тут Скрыпу можна паставіць у пачэсны шэраг найлепшых айчынных рок-паэтаў разам з Вольскім і Анемпадыставым.

**СБ**

## Рок бяз лаянкі

4 і 5 сьнежня ў Полацкім палацы культуры адбыўся фэст «Рок па-над Полацкам», у якім узялі ўдзел тры дзясяткі гуртоў. Гэта адбор на юбілейнае «Рок-кола», што адбудзецца ў траўні 2005 г. Ад удзельнікаў патрабаваліся прэзэнтаваць тры песьні — абавязкова беларускамоўную, аўтарскую і кавэр на вядомы твор. Акрамя таго, у рэглямэнце былі прапісаны правілы паводзінаў на сцэне: нельга паліць і брыдка лаяцца.

Сярод ляўрэатаў — група «Анці» з Навапалацку, якую пры ўдалым зьбегу абставін можа чакаць слава «Ляпісаў». Хлопцы стварылі свой кірунак — т.зв. «піянер-рок»: адпаведны сцэнічны імідж і пацыфісцкая скіраванасьць твораў. Адно з адкрыцьцяў 2004 г. у беларускай музыцы — «Фляўс і Кляйн». Галоўны «фляўс» пускаў па сцэне караблікі, бегаў з сасіскамі, і пры гэтым група стварала Музыку — свайго роду бел-поп.

Вызначылася сваім кавэрам і група «Восьмы дзень» зь Віцебску — яны зайгралі «Касіў Ясь канюшыну» пад музыку зь фільму Квэнціна Таранціна.

У траўні на полацка-наваполацкай рок-высьпе мае адбыцца вялікае юбілейнае «Рок-кола» з удзелам сёлетніх пераможцаў і найлепшых беларускіх гуртоў.

**Сяргей Будкін, Полацак**

# Ліцэйская якасьць

**Сіўковіч Валянціна. Беларуская мова.** Кароткі даведнік: Для школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў. — Менск: УнівэрсалПрэс, 2004.

**Сіўковіч Валянціна. Беларуская мова ў пытаньнях, адказах і практыкаваньнях:** Для вучняў старэйшых клясаў, для абітурыентаў, для студэнтаў-практыкантаў, для настаўнікаў, для самаадукацыі. — Менск: УніверсалПрэс, 2004.

Гэтыя дзьве кніжкі — адна кампактная, на няпоўную сотню старонак, другая — грунтоўны фаліянт на 32 з паловай выдавецкія аркушы — яшчэ адзін канкрэтны плён дзейнасьці Беларускага гуманітарнага ліцэю. Сёньня ліцэісты вывучаюць гісторыю па «нарысах» Сагановіча і Шыбекі, літаратуру — па кнізе аўтара гэтых радкоў (другая частка рыхтуецца да выданьня ў суаўтарстве зь Міхасём Тычынам і Пятром Васючэнкам), цяпер адмысловыя дапаможнікі яны будуць мець і на занятках па практычнай граматыцы беларускай мовы.

Валянціна Сіўковіч 10 гадоў выкладае ў ліцэі названую дысцыпліну й належыць да грона самых паспяховых і творчых выкладнікаў. Пад кіраўніцтвам спн.Валянціны дзясяткі ліцэістаў заваёўвалі дыплёмы Ўсебеларускіх алімпіяд, што, аднак, сталася ў прынцыпе немагчымым пасьля таго, як ліцэй быў змушаны перайсьці ў падпольле.

Фармулёўкі зьмешчаных у рэцэнзаваных кнігах пачаткаў агульнай лінгвістыкі, правілаў «школьнае граматыкі», практыкаваньні, творчыя заданьні працяглы час «габляваліся» на занятках зь ліцэістамі. Праз гэта абодва дапаможнікі выгадна адрозьніваюцца ад аналягічных іншых кніжак, у вялікай колькасьці падрыхтаваных апошнім часам супрацоўнікамі розных унівэрсытэцкіх катэдраў. В.Сіўковіч ведае, *як* падаць матэрыял 15—17-гадовым вучням, як запамінальна яго праілюстраваць і як пракантраляваць выкананьне прапанаваных заданьняў. Асаблівая ўвага зьвяртаецца на пераадоленьне тых момантаў, што традыцыйна ўважаюцца за складаныя, — перадусім гэта розныя віды фанэтычнага, марфалягічнага ды сынтаксычнага разбораў.

Да кожнага з 330-ці практыкаваньняў у канцы кнігі зьмешчаны адказы — кожны, хто працуе з кнігай самастойна, мае магчымасьць спраўджваць трываласьць сваіх ведаў.

Неўзабаве камплект з двух дапаможнікаў, створаных В.Сіўковіч, мае папоўніцца трэцім — зборнікам тэстаў па беларускай граматыцы. А ў бліжэйшым часе хацелася б убачыць і грунтоўны падручнік навучаньня жывому беларускаму маўленьню, з дадаткам аўдыё- і відэаматэрыялаў. В.Сіўковіч, іншыя асобы, так ці інакш зьвязаныя зь Беларускім ліцэем — Пятро Садоўскі, Юрась Бушлякоў, Вінцук Вячорка, Зьміцер Саўка й ці мала яшчэ хто — маглі б гэтыя праект




**Валянціна Сіўковіч (справа) з гадаванцамі-ліцэістамі на выпускной лінейцы.**

ажыцьцявіць, паасобку ці ў хаўрусе. Сёньняшняя дзяржава гатова цярпець *помнікі* беларускай мове, але яна ніколі не паспрыяе праектам, праз якія пашыралася б кола *рэальна беларускамоўных* асобаў. Таму гэтую справу мусіць узяць у рукі наша грамадзтва.

**Лявон Баршчэўскі**

## Беларускае жыцьцё

### Каханак яе вялікасьці

У пятніцу, **17 сьнежня**, адбудзецца прэзэнтацыя кнігі гістарычнай прозы Ўладзімера Арлова «Каханак яе вялікасьці». Удзел возьмуць сябры і калегі пісьменьніка. Засьпяваюць беларускія барды, жывы аўтар дасьць аўтограф. Пачатак а 18-й гадзіне ў вялікай залі Дому літаратараў (Фрунзэ, 5). Уваход вольны.

### Арыгінальныя «Морсы»

Лідэры паводле FM-ратацыяў сярод беларускіх музыкаў — «J-Mors» **— 10 сьнежня** дадуць сольны канцэрт, прысьвечаны небанальнаму выхаду іх новага сынглу. «Морсы» — першыя ў нашай музычнай гісторыі, хто наважыўся выпусьціць яго толькі ў віртуальнай прасторы (single. telecom.by). Той, хто хоча сабе дыск — згружае песьні, вокладку і робіць сам сабе дыск. За распаўсюд твораў група не атрымае ні капейчыны, але спадзяецца на рэклямны эфэкт. Сярод песень музыкі робяць стаўку на беларускамоўную «100 дарог», якую Пугач засьпяваў разам з Тамарай Лісіцкай і Ларысай Грыбалёвай. Але ў самы апошні момант, праз кампутарны збой, частка музычных партый згубілася, таму ў прасторы яна зьявіцца пазьней. Затое 10 сьнежня новыя і старыя «морсаўскія» песьні можна будзе пачуць у клюбе «Рэактар» а 19.00.

Цана квітка — 8000–12000 руб. У канцэрце таксама возьме ўдзел Валік Грышко.

### Гісторыкам

**15 сьнежня** ў 44 аўдыторыі гістфаку БДУ а 18-й гадзіне адбудзецца пасяджэньне клюбу па актуальных пытаньнях гісторыі. Выступоўца Міхаіл Папоў, асьпірант БДУ, дасьледуе гісторыю каталіцкага касьцёлу на тэрыторыі Беларусі. Цягам выкладу ахвотныя атрымаюць магчымасьць абмеркаваць стан Рыма-каталіцкай царквы на беларускіх землях ва ўмовах зьмены дзяржаўнасьці ў канцы XVIII — пачатку XIX ст.

### Блюз-рок+

У суботу, **11 сьнежня**, а 20-й гадзіне ў кавярні «Добрыя мысьлі» (вул.Магілёўская, 12) адбудзецца канцэрт акустычнага дуэту Дзьмітрыя Цюраева і Аляксея Бора «Блюз-рок+». Квіткі — 4000.

## Тэатры і канцэртныя залі

### Опэра

**9** (чц) — «Тоска».
**11** (сб) — «Яўген Анегін».
**14** (аўт) — «Травіята».
**16** (чц) — «Рыгалета».
**17** (пт) — «Манюшка на радзіме».
**18** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**19** (ндз) — «Трубадур».

### Балет

**10** (ср) — «Страсьці».
**12** (ндз) — «Дон Кіхот».

### Тэатар імя Янкі Купалы

**9** (чц), **10** (пт) — «Эрык XIV».
**11** (сб) — «Таполевая завея».
**12** (ндз) — «С.В.».
**13** (пн) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**15** (ср), **16** (чц) — «Ідылія».
**17** (пт) — «Каханьне ў стылі барока».
**18** (сб) — «Парфён і Аляксандра».
**19** (ндз) — «Смак яблыка».

**Ранішні спэктакль**
**12** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Малая сцэна**
**9** (чц), **12** (ндз) — «Баляда пра каханьне».
**11** (сб) — «Муж для паэтэсы».
**17** (пт) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**19** (ндз) — «Саламея».

### Тэатар беларускай драматургіі

**9** (чц) — «Песьні ваўка».
**14** (аўт), **15** (ср) — «Валянціна».
**17** (пт) — «Адвечная песьня».
**18** (сб) — «Адэль».
**19** (ндз) — «Містэр Розыгрыш».

**На сцэне Тэатру беларускай драматургіі гастролі Акадэмічнага драматычнага тэатру імя Я.Коласа**
**10** (пт), **11** (сб) — «Праўда — добра, а шчасьце — лепш».

### Тэатар імя Горкага

**9** (чц) — «Анджэла і іншыя».
**10** (пт) — «Паведамленьне Марыі».
**11** (сб) — «Перад захадам сонца».
**12** (ндз) — «Зязюльчыны дзеці».

### Музычны тэатар

**9** (чц) — «Арфэй і Эўрыдыка».
**10** (пт) — «Галяктыка каханьня».
**11** (сб) — «Дарагая Памэла».
**12** (ндз) — «Каралева чардашу».

### Моладзевы тэатар

**9** (чц) — «Позьняе каханьне».
**10** (пт) — «Лейтэнант Валодзька».
**11** (сб) — «Пігмаліён».
**12** (ндз) — «Акадэмія сьмеху».

### Тэатар-студыя кінаактора

**9** (чц), **10** (пт) — «Апошняя жанчына Дона Хуана».

### «Дзе я?»

**9** (чц) — «Дазвольце спадзявацца».
**10** (пт) — «Ня бойся быць шчасьлівым».

### Тэатар юнага гледача

**17** (пт) — пастаноўка Рамана Вікцюка «Кармэн».

### Заля камэрнай музыкі

**11** (сб) — канцэрт камэрнай музыкі.
**13** (пн) — канцэрт фартэпіяннай музыкі.

### КЗ «Менск»

**10** (пт) — канцэрт, прысьвечаны 20-годзьдзю ансамбля «Сьвята».
**11** (сб) — гітарыст «ДзіДзюЛя» і гурт «ДзіДзюЛя».
**12** (ндз) — мужчынскі балет «Мужчына &... новыя варыяцыі на старую тэму».

### Палац Рэспублікі

**9** (чц) — канцэрт Мікалая Наскова «Да поясу ў неба».
**11** (сб) — ансамбаль «Сябры» з праграмай «Нашы песьні, як наша жыцьцё».

### Цэнтральны дом афіцэраў

**10** (пт) — «Харошкі».

### Палац спорту

**15** (ср) — гурт «Экс-ББ».
**17** (пт) фэстываль-чэмпіянат усходняга танцу «Ўсходнія ласункі-2004».

### ДК МТЗ

**19** (ндз) — VI фэстываль гітарыстаў «Грыфаманія-2004».

### ДК чыгуначнікаў

**9** (ндз) — Аляксандар Баль з праграмай «Выбранае».

## Выставы

### Навагодні кірмаш

З **17** да **31 сьнежня** ў выставачным павільёне на Я.Купалы, 27 працуе «Навагодні кірмаш-2004».

### Мастацкая выстава ў Наваполацку

**9 сьнежня** ў Наваполацку адкрываецца мастакая выстава па выніках пленэру, прымеркаванага да 80-х угодкаў Васіля Быкава. Пленэр адбыўся гэтым летам на радзіме народнага пісьменьніка.

### Беларусь на старажытных мапах

Да **15 сьнежня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстава «Беларусь на старажытных мапах».

### Нясьвіскія зборы Радзівілаў

У Мастацкім музэі да **8 студзеня** працягваецца выстава «Нясьвіскія зборы Радзівілаў». Там жа да 4 студзеня ідзе выстава «Мэлёдыя лета» — жывапіс Марыі і Мікалая Ісаенкаў.

### Японская кераміка

Да **6 студзеня** ў Мастацкім музэі працуе выстава «Японская кераміка». Экспазыцыя складаецца з 63 твораў, выкананых 55 японскімі ганчарамі. Майстры Кавай Кандзіра і Хамада Сёдзі вядомыя сваімі творамі ва ўсім сьвеце. Квіткі — 2000.

## Клюбнае жыцьцё

### Белая вежа (284–69–22)

**9** (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Grizzly, go-go.
**10** (пт), 23.00 — dj Mihel, go-go.
**11** (сб), 22.00 — dj Mihel, go-go.
**12** (ндз), 22.00 — dj Alex.

### Бліндаж (219–00–10)

**9** (чц), 23.00 — dj Egor.
**10** (пт), 23.00 — dj Egor.
**11** (сб), 23.00 — dj Egor.
**12** (ндз), 23.00 — dj Egor.

### Bronx (288–10–61, Velcom: 103, 105)

**9** (чц), 22.00 — dj L.Dubrovskaya (Масква).
**10** (пт), 22.00 — жывая музыка: «Atava».
**11** (сб), 23.00 — «DR's live percussion show»: dj A.Tchouprina, dj Shishkin.

### Графіці (251–87–54)

**9** (чц), 20.00 — канцэрт Алены Казанцавай.
**16** (чц), 20.00 — канцэрт Аляксея Вайцяховіча.

### Гудвін (226–13–06, 626–13–03)

**9** (чц), 21.00 — жывая музыка.
**10** (пт), 21.00 — жывая музыка.

### Рэактар (649–08–88, 766–24–25, 400–67–74)

**12** (ндз), 19.00 — прэзэнтацыя першага беларускага інтэрнэт-сынглу гурту «J_Морс» «100 дарог». Квіткі: танцпол — 8000, столік — 12000.

### X-Ray (223–93–55)

**10** (пт), 22.00 — dj Grizzly.
**11** (сб), 22.00 — dj Noche.

## Для дзяцей

### Тэатар юнага гледача

**9** (ндз) — «Паліяна».
**15** (сб) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**16** (ндз) — «Каліф-шавец».

### Опэра

**12** (ндз) — «Горад майстроў».
**19** (ндз) — «Кот у ботах».

### Тэатар беларускай драматургіі

**10** (пт), **11** (сб) — «Прыгоды вандроўнага рыцара».

### Музычны тэатар

**11** (сб) — «Залатое кураня».
**12** (ндз) — «Стойкі алавяны салдацік».

### Юнаму гледачу:

**«Аўрора»**
«Блізард»: **10—12** (пт—ндз) 14.30.
**«Берасьце»**
«Гуляй як Бэкхем»: **10** (пт) 14.00.
«Легенда пра рыцара»: **10** (пт) 10.30; **11, 12** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Грынч, выкрадальнік Каляд»: **10** (пт) 12.00; **11** (сб) 11.00; **12** (ндз) 13.00.
«Вядзьмарка ў сям'і»: **10** (пт) 14.00; **11** (сб) 13.00; **12** (ндз) 11.00.
**«Мір»**
«Два браты»: **11, 12** (сб, ндз) 14.00.
**«Піянер»**
«Пітэр Пэн»: **10** (пт) 15.00; **11** (сб) 13.20; **12** (ндз) 13.30.
«Кніга джунгляў»: **10** (пт) 11.00; **11** (сб) 10.20; **12** (ндз) 10.20, 12.00.




## Менская кінаафіша з 10 да 12 сьнежня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Жанчына-котка» (прэм'ера): **10** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00.
«Эфэкт матылька»***: **10—12** (пт—ндз) 18.40, 20.50.
«Брудныя танцы-2»: **10—12** (пт—ндз) 16.40.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Уімблдон»: **10** (пт) 16.30 (іл), 18.50 (іл), 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 18.50, 21.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Белыя цыпачкі»: **10** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **11** (сб) 18.00, 20.00; **12** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Жанчына-котка» (прэм'ера): **10** (пт) 14.40, 16.50, 18.50, 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.50, 18.50, 21.00.
**«Масква»** (223-27-10)
«Жанчына-котка» (прэм'ера): **10** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
**«Мір»** (284-37-71)
«Людзі на балоце» (да 80-годзьдзя беларускага кіно): **11** (сб) 13.00.
«Уімблдон»: **10, 11** (пт, сб) 17.30, 19.20, 21.00; **12** (ндз) 15.00 (іл), 17.30, 19.20, 21.00.
«Забойная парачка: Старскі і Хатч»: **10—12** (пт—ндз) 16.40, 18.30, 20.20.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Галава ў воблаках»***: **10** (пт) 18.40; **11, 12** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.40.
«Пярэпалах у інтэрнаце»***: **10** (пт) 14.40, 16.40, 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 14.00, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Два нулі»: **10** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **11** (сб) 15.20, 17.00, 19.00, 21.00; **12** (ндз) 15.30, 17.00, 19.00, 21.00.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Рамасанта: паляваньне на ваўкалака»*** (прэм'ера): **10** (пт) 17.00, 21.00; **11, 12** (сб, ндз) 13.00, 17.00, 21.00.
«Уімблдон»: **10** (пт) 11.00, 13.00, 15.00, 19.00; **11, 12** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

**Матэрыялы паласы падрыхтавалі Наста Бакшанская, Сяргей Будкін, Сяргей Петрыкевіч**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Кіска–садыстка і кепскія касмэтолягі



MOVIEWEB.COM

«Жанчына-котка» («Catwoman»)
ЗША, 2004, каляровы, 104 хв.
**Жанр:** Комікс-прыгоды.
**Адзнака:** 2,5 з 10.

Пасьля сьмерці затурканая працаўцамі дызайнэр касмэтычнай фірмы (Холі Бэры) пераўтвараецца ў жанчынукотку. Апрануўшы кашэчы прыкід, яна помсьціць мужыкам (і бабам) за загубленае жыцьцё. У праграме рамантычнае каханьне, вандроўкі па начных дахах, рабаваньне ювэлірнай крамы й пошукі забойцаў.

Холі Бэры — някепская актрыса, нават аднойчы атрымала «Оскара». Але ў карціне «Жанчына-котка» галоўнае не яе акторскія здольнасьці, а касьцюмчык. Пазычаны гэты глямурны цуд у найбліжэйшым сэкс-шопе: скураны, чорны, мінімалісцкі. У рыштунак таксама ўваходзяць абцягнутая латэксам попка, намаліненыя губкі і дыямэнтавыя кіпцюры. У сьветлыя… цьфу ты! цёмныя ручкі Холі Бэры ўкладзены бізун.

«Мяўклівая» жанчына ўжо вандравала ў кіно з коміксаў: так «акацелая» Мішэль Пфайфэр складала канкурэнцыю Бэтмэну ў фільме Ціма Бэртана. Сёньняшняя жанчына-котка паліткарэктна чарнаскурая і па-зграбнаму пустая.

Француз Пітоф дэманструе самыя кепскія якасьці сваёй рэжысуры: камэра мітусіцца, імпэтна шморгае і лунае, дэталі кідаюцца ў вочы.

Нікчэмна-крутое мачылава паміж Холі Бэры й Шарон Стоўн, якая грае злую цёцю, абароненую касмэтычным прэпаратам, спадабаецца некаторай частцы мужчынскай аўдыторыі.

На кінасайце «Imdb.com» гледачы занесьлі «Жанчыну-котку» ў ганаровы сьпіс 100 найгоршых фільмаў за ўсю гісторыю кіно. Але ў квартале Чырвоных Ліхтароў — гэта гіт сэзону.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Застой! Застой! Застой!

Нарэшце! Нарэшце ў эРБэ, адпаведна рытарыцы ўладаў, настала эпоха, фармальна падобная да савецкага застою, — час, які, паводле бацькавай «настальжы», быў «залатой эрай» чалавецтва.

Горача падтрымліваю тэзісы АРЛ, якія ён прадэкляраваў 17 лістапада. Слухаў іх як песьні Пахмутавай — так яны нагадалі распрацоўкі ідэалягічнага аддзелу ЦК КПСС часоў Хрушчова і Брэжнева. Прыблізна ў тыя часы, калі сабакі-касманаўты Белка і Стрэлка канстатавалі для сябе факт, што зямля сапраўды мае форму шара, зь лексыкону савецкіх прапагандыстаў зьніклі словы аб клясавай барацьбе ў СССР. Генсекі пачалі сьцьвярджаць, што на прасторах адной шостай склалася новая бесканфліктаная гістарычная супольнасьць, г.зн. савецкі народ. Натуральна, барацьба з апазыцыяй у такіх умовах страціла сэнс. У соцыюме, дзе няма клясаў, змагацца з сыстэмай могуць хіба псыхічна хворыя. Тэзіс аб тым, што клясавая бойка — finita la comedia, дарэчы, стаў фармальнай падставай для «вялікай камуністычнай схізмы» паміж Масквой і Пэкінам. Мао сьцьвярджаў, што любы дырэктар калгасу для пастуха і трактарыста ў нейкім сэнсе клясавы мудак, якога трэба аддаць на расправу хунвэйбінам.

Практычна тое самае, што калісьці Леанід Ільіч, дэкляраваў кіраўнік краіны 17 лістапада. Апазыцыя як сіла, што абапіраецца на грамадзкія настроі, пасьля рэфэрэндуму дала дубу. Грамадзтва РБ у натуры аб'ядналася вакол прынцыпаў падручніка «Асновы дзяржаўнай ідэалёгіі РБ» і гатова скласьці галовы, каб дасягнуць найвышэйшай стадыі гістарычнай фармацыі «рынкавы сацыялізм» — «усе ўмовы для нармальнага жыцьця».

Як камунізм у часы СССР, гэтыя «ўсе ўмовы» могуць быць забясьпечаны шляхам удасканаленьня мадэлі. Пад гэтым пры саўку разумелася ліквідацыя на кожным этапе розных нэгатыўных зьяваў — у 1960-я п'яніц і фарцоўшчыкаў, у 1970-я алькаголікаў і прагульшчыкаў, у 1980-я — п'яніц, алькаголікаў і алькашоў. Галоўныя бар'еры на шляху да беларускай «ікарыі» прэзыдент таксама акрэсьліў — бігборды з «замызганымі французжанкамі», хабары настаўнікам (часам яны бяруць натурай), п'яныя сантэхнікі і сьмярдзючыя шафёры, якія ўдзень езьдзяць з уключанымі фарамі, нарэшце дзеці, якія падселі на заходні way of life…

Шчыра баюся, гэтая канцэпцыя Рыгоравіча можа наткнуцца на неразуменьне апазыцыі. А што, калі заўтра адмарозкі зноў выйдуць на вуліцы? Няўжо гэта будзе сьведчыць аб тым, што ў РБ засталіся падставы для палітнезадаволеньня? Выйсьце: усе дэлікты апазыцыі павінны падводзіцца пад праявы актыўнасьці адзначаных вышэй катэгорый. Напрыклад, калі бяром пад арышт Вячорку, то як «п'янага сантэхніка», калі мочым у «Патыё-Піцы» Лябедзьку, то таму, што ён быў падобны звонку на «замызганую французжанку». Ну а ў Шушкевіча на лычыне напісана, што ён бэбі, якога падсадзілі падчас лекцый ва ўнівэрах ЗША на «Сьнікерсы» і «Марсы». Галоўнае — не адрывацца ад парадыгмы: няма ў нас ніякай апазыцыі. У нас застой!

**Лёлік Ушкін,**
**левы радыкал**

***P.S.*** Аднаго не разумею — а дзе гарэлка за чатыры восемдзесят?!

КАІСА

## З жыцьця чэмпіёнаў

Мікола Аляўдзін у другі раз выйграў першынство сталіцы, што паўвосені цягнулася ў Палацы шахмат і шашак. Першае пакарэньне вяршыні адбылося пазалетась, і тады чэмпіёну ўручылі сумку. За трэцяе месца ў 2003 г. прызэр атрымаў мэдаль, здалёк падобны да бронзавага. Цяпер была заваявана дыхтоўная шкатулка з надпісам «чэмпіянат Менску». «Папраўдзе, крыўдна, што не напісана, за якое месца мне яе далі», — ці то жартам, ці ўсур'ёз кажа М. Аляўдзін. У першым туры (з 11) ён прайграў, у другім зґуляў унічыю, а потым распачаў файную сэрыю перамог. Зусім у духу ранняга Бобі Фішэра, які прагнуў змагацца да апошняй пешкі. Нездарма большасьць сёлетніх партый сп.Аляўдзіна вырашалася ў эндшпілі.

24-гадовы чэмпіён — з тых амбітных шахматыстаў, якім у Беларусі, акрамя навамоднага спаборніцтва ў Віцебску, асабліва няма дзе практыкавацца. Таму ён почасту выяжджае на адкрытыя турніры ў Польшчу і Ўкраіну. Сёлета на адным зь іх, у Цярнопалі, заняў першае месца, апярэдзіўшы трох міжнародных майстроў, ды выканаў норму адпаведнага балу. Нядаўна яму надалі ганаровае званьне майстра ФІДЭ.

Навасьпечаны майстар любіць сыцыліянскую абарону і ход 1. e2-e4 за белых, добра пачуваецца ў пазыцыйнай гульні. У гэтым, відаць, сказваецца ўплыў яго трэнэра Генадзя Лібава. Сам сп.Аляўдзін ужо колькі гадоў вучыць дзяцей гуляць у шахматы ў сваёй alma mater — Менскім палацы дзяцей і моладзі, куды прыйшоў падлеткам. Прынцып яго працы — самастойнасьць выхаванцаў, бо «ніводзін настаўнік ня можа ўсяму навучыць». У вольны ад шахматаў і трэнэрства час сп.Аляўдзін займаецца… шахматамі. Спадзяецца стаць гросмайстрам, хоць, паводле яго слоў, каб узяць вышэйшую плянку, найлепш пачынаць з 5-гадовага ўзросту.

Цікава, што і ў чэмпіянаце Менску сяроднжанчын першае месца заняла трэнэрка — майстарка ФІДЭ Таццяна Бондар, што ў 90-я гады засвойвала шахматную навуку ў Палацы дзяцей і моладзі.

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Пруціян—Аляўдзін, Менск, 2004.**

**Ход чорных. Іх слон выглядае пасіўным. Як дзейнічаць?**



Адказ: 1...c4 2. Kd7 Cd6 (каб прадухіліць перавод каня b8-c6) 3. Кb6 e4! і неўзабаве чорныя рэалізавалі лішнюю пешку.

# Гэтым пераможам




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Такі надпіс зьявіўся ў адным з двароў менскай Малінаўкі раніцай 4 сьнежня. З дапамогай сьнегу ў каханьні можна прызнацца маштабна і абсалютна бяскарна.**

Дзякуем шчыраму беларусу, на сродкі якога Валянціна Івуць падпісала 13 сярэдніх школаў і 3 прафтэхвучэльні Слуцку на газэту «Наша Ніва»

**Запрашаем у падарожжа**
**12 сьнежня** (нядзеля)
«**Нёманская каса**» па маршруце: **Менск—Вузда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Вішнявец—Новы Сьвержань—Менск**. 18000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**Творчая гасьцёўня «Маладзік»**
**11 сьнежня 2004 16.00**
**Супольны канцэрт**
**Сяргей Верамейчык і студыя «Альтанка»** з Залесься (сядзіба Агінскіх)
**гурт «Рэха»** (Менск)
Палац моладзі (Старавіленскі тракт, 41) кіналекцыйная заля
праезд трамваямі №3,4,5,10 да прыпынку «Палац моладзі»
Даведкі і квіткі па т.: 262-02-90

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**«КРОСНЫ»**

**Менскі палац дзяцей і моладзі** (Старавіленскі тракт, 41) праводзіць дадатковы набор у клюб беларускай даўніны «Кросны», у якім у вас будзе ўнікальная магчымасьць дакрануцца да гісторыі Беларусі (архаічная вышыўка, старадаўняе ткацтва, традыцыйны крой, элемэнты абраднасьці, экспэдыцыі). Заняткі ў нядзелю, пакой 405. Даведкі праз т.: 233-81-11 (Вольга), 270-28-78 (Вадзім)

**КАЛЯДНАЯ МАЙСТЭРНЯ**

**У нас вучаць на калядоўшчыкаў** + калядны камплект (зьвязда і каза). Усё задарма. Прыходзьце, моладзь, малыя і старыя, у чацьвер з 15.00 да 20.00, у пятніцу з 15.00 да 20.00 і ў суботу з 11.00 да 17.00 на Кірава, 14 (НЦТДзМ). Аўд.308, студыя «Рагнеда». Т.: 250-98-67, 690-92-56

**ВІТАНЬНІ**

**Віншую** з Днём нараджэньня Ўладзімера Логаша (Горадня), шчырага беларуса, улюбёнага краязнаўца. А.Жалкоўскі (Ліда)

**КАНТАКТЫ**

**Кірыла**, патэлефануй Валянціне!

**Куплю** узнагароды БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота вайскоўцаў (беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-й сусьветнай вайны). Э-адрас: zmagar@yahoo.com. Т.: 8-029-722-46-04

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Алесю А. зь Менску.** Падручнікі і ўнівэрсытэцкія курсы ідэалёгіі — гэта тое, ад чаго трэба адмовіцца. Немагчыма «падстроіць» таталітарную практыку пад нацыятворчыя мэты. Ідэалёгія мусіць быць прадметам вывучэньня гуманітарных навук, а не спосабам індактрынацыі. Таму «напісаньне кніжкі па ідэалёгіі беларускай дзяржавы зь несаўковага пункту гледжаньня» — нонсэнс.

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3516. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 08.12.2004.
Замова № 7440.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а